Гар. Пуб. Бібліят. УССР

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 36 (6012) | 14 лютага 1938 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб арганізацыі і фінансаванні рамонту трактараў, камбайнаў і сельскагаспадарчых машын МТС. Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ: Палітычнае выхаванне ў сярэдняй школе.

На дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс».

Папанінцы бачылі праменні пражэктара «Таймыра».

Пахаванне адважных паветраплаваценяў.

Насустрач XX гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

АРТЫКУЛЫ:

С. Б. — Перамога сталінскага стратэгічнага плана.

В. П. Смолер. — Разглядаем апеляцыі выключаных.

Е. Залескі. — Вялікія перамогі калгаснага ладу.

Н. Жынко. — Больш увагі навучанню дарослых.

В. Гарадзінскі. — А. С. Даргамыжскі.

П. І. Петухоў. — Уся плошча ільну замацавана за звеннямі.

В. Міронаў. — Аматаравіцъ конскае пагалоўе.

ЗА РУБЯЖОМ:

Зварот да іспанскіх працоўных. — На франтах у Іспаніі. — Пратэст ЦК компартыі Францыі. — Магутная антыфашысцкая дэманстрацыя ў Парыжы. — Міжнародная дапамога рэспубліканскай Іспаніі. — Ваенныя дзеянні ў Кітаі. — Замятаюць сляды... — Становішча ў Румыніі. — Падзеі ў Германіі: Масавыя расстрэлы ў арміі; Крывавыя сутычкі ў Кенігсбергу і Мюнхене.

ПАЛІТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ У СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

Совецкі педагог, акружаны велізарнейшымі клопатамі нашай партыі і ўрада, заклікан не толькі даваць неабходную суму ведаў навучаючымся, але і выхоўваць у комуністычным духу маладых грамадзян краіны социялізма, маладых патрыётаў радзімы. На гэта не раз указвала наша партыя ў сваіх гістарычных рашэннях аб школе і патрабавала ад органаў народнай асветы, ад усіх «вялікіх» і «малых» работнікаў выхаваўчага фронта — паставіць у цэнтры работы палітычнае выхаванне, якое павінна з'явіцца краевугольным камнем у фармаванні светапогляду нашых дзяцей.

Нашы будучыя кадры павінны ўцягвацца ў палітычнае жыццё нашай краіны, ужо зараз набываючы палітычны вопыт і загартоўку для будучай работы і барацьбы. Вось чаму палітычнае выхаванне ў сярэдняй школе з'яўляецца задачай велізарнай важнасці, умовай самай лепшай барацьбы за авалоданне вышынямі навукі, вышынямі чалавечай культуры.

У справе палітычнага выхавання ў сярэдняй школе несумненна ў першую чаргу выключную ролю адыгрывае ўрок. Урок павінен быць насычаным найцікавейшымі фактамі, матэрыяламі нашай сапраўднасці. І толькі пры гэтай умове будзе адчувальнай яго сіла ўздзеяння, будзе забяспечана социялістычная дысцыпліна. Надзежда Канстанцінаўна Крупская на запытанне аднаго настаўніка з Беларусі, як лепш забяспечыць дысцыпліну, а гэта значыць і паспяховасць вучняў, адказала:

«Вы самі ведаеце, што крыкамі, вымовамі, пакараннямі, скаргамі бацькам дысцыпліны не наладзіш. Уся справа ў тым, каб зацікавіць дзяцей, зрабіць урокі цікавымі, арганізаваць самадзейнасць, дружную работу навучаючыхся».

Кожны вучэбны прадмет, кожнае жывое пачынанне ў школе, звычайныя сходы вучняў даюць велізарныя магчымасці для палітычнага выхавання дзяцей. Неабходна толькі гэтыя магчымасці ўмела скарыстаць.

Выдатнай крыніцай палітычнага выхавання з'яўляецца выкладанне ў школах гісторыі. Бязмежная любоў да сваёй радзімы, палкая нянавісць да ворагаў народа, эксплаататараў, ідэі інтэрнацыяналізма — усе гэтыя якасці пагінны прывіваецца вучням на ўроках па гэтаму прадмету. А прыродазнаўства, а геаграфія, фізіка? Усе прадметы павінны ўзброіваць дзяцей матэрыялістычнымі ведамі, выхоўваць іх супроць розных рэлігійных забабон. Не можа быць ні аднаго прадмета ў школе, які астаўся-б у баку ад задач палітычнага выхавання.

Совецкая школа мае ў сваім распараджэнні найбагацейшыя магчымасці для забеспячэння сапраўды высокай якасці палітычнага выхавання нашых дзяцей. Гэтыя магчымасці створаны ў выніку перамогі социялізма ў нашай краіне, у выніку велізарнейшых заваяванняў нашага народа пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна.

Але, на жаль, не ўсюды, не ва ўсіх школах справа палітычнага выхавання стала першаступеннай задачай. Фактжа, што выкладанне Сталінскай Канстытуцыі — гэтага выдатнага дакумента нашай эпохі, які мае выключную выхаваўчую ролю, у радзе месц не забяспечана. Ворагі народа, доўгі час арудаваўшыя ў органах народнай асветы, свядома зрывалі выкладанне гэтай важнейшай дысцыпліны. Вынікі шкодніцтва яшчэ і зараз да канца не ліквідаваны. У радзе школ Кармянскага, Лоеўскага, Лельчыцкага і іншых раёнаў Сталінская Канстытуцыя не выкладаецца.

Совецкую дзетвару трэба выхоўваць у духу непрымірымасці да класавага ворага, у духу любві і адданасці сваёй социялістычнай радзіме. І там, дзе пранікаюць у школу варожыя ўплывы, неабходна процідаставіць здаровы настрой вучняў, мабілізаванасць, і на прыкладах барацьбы з варожымі праявамі выхоўваць школьную моладзь. У радзе школ аб гэтым забываюць. Так, напрыклад, у Касцюковіцкай і Багушэўскай сярэдніх школах настаўніцкі калектыў не правёў шырокай выхаваўчай работы з мэтай выкрыцця шкодных уплываў, меўшых месца ў школах. У Нікіцінскай няпоўнай сярэдняй школе (Шклоўскі раён) зусім нядаўна меў месца недапушчальны факт, калі замест урока фізкультуры тут арганізавалі гульню «ў палітфант», якая страшэнна скажала сутнасць палітычнага выхавання.

Зразумела, што палітычнае выхаванне прадугледжвае сур'ёзную і штодзённую работу ў сценах школ комсамольскіх і піонерскіх арганізацый. Задачы гэтых арганізацый заключаюцца ў тым, каб усімі сіламі, усімі сродкамі дапамагаць педагогу — выхавацелю, не падмяючы яго і не перашкаджаючы яму. А трэба прама сказаць, што на гэтым участку ў нас — самыя буйныя недахопы. ЦК ЛКСМБ, гаркомы, райкомы, пярвічныя арганізацыі комсамола не забяспечваюць плённай работы комсамольцаў і піонераў у школах. У барацьбе за якасць вучобы комсамольскія і піонерскія арганізацыі нічым сябе не праяўляюць. ЦК ЛКСМБ па сутнасці не кіруе школьнымі арганізацыямі. Толькі па гор. Менску яшчэ да гэтага часу больш 100 піонерскіх атрадаў не забяспечаны важатымі. Ва многіх сярэдніх школах у раёнах таксама няма піонерскіх важатых, а ў радзе школ атрады зусім адсутнічаюць.

Неабходна рашуча палепшыць работу комсамольскіх і піонерскіх арганізацый у школе, яны павінны разам з педагогамі выносіць на шырокае абмеркаванне вучняў такія пытанні, як дысцыпліна, паспяховасць, пашана да старэйшых, акуратнасць. Сапраўдныя социялістычныя якасці неабходна выхоўваць у нашай шчаслівай дзетвары.

У сістэме палітычнага выхавання ў сярэдняй школе несумненна важнае месца павінна заняць палітычнае выхаванне саміх настаўнікаў і работа з бацькамі. Трэба прама сказаць, што многія партыйныя арганізацыі яшчэ не зразумелі таго, што іх абавязак забяспечыць палітычную адукацыю настаўнікаў, іх абавязак па-сапраўднаму ўкараняць у сазнанне настаўнікаў марксісцка-ленінскае вучэнне.

Ва многіх раёнах (Клімавічы, Смілавічы, Клічаў) не працуюць палітгурткі для настаўнікаў. Нават у Менску ў радзе школ (47-я і інш.) вельмі часты зрывы палітычных заняткаў. Ці трэба даказваць, што той настаўнік, які сам не павышае свайго ўзроўню, не можа па-сапраўднаму выхоўваць дзяцей. Задача ўсіх партыйных арганізацый у максімальна кароткі тэрмін забяспечыць арганізацыю палітычнай вучобы настаўнікаў. Палітгурткі павінны мець высокакваліфікаваныя прапагандысцкія кадры.

Усе пытанні палітычнага выхавання ў школе неабходна паставіць у цэнтр увагі работы вялікаа атрада настаўнікаў Совецкай Беларусі. Неабходна пакончыць і з фактамі няўважлівых адносін да настаўнікаў з боку асобных работнікаў. У радзе месц (Магілеў, Рагачоў, Сянно і інш.) паклёпнікі і іх саўдзельнікі знясаўлялі чэсных настаўнікаў, не давялі ім магчымасці працаваць на фронце народнай асветы. Гістарычнае рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) катэгарычна патрабуе ад усіх арганізацый праяўлення чулых і ўважлівых адносін да людзей. Неабходна рашуча выправіць дапушчаныя памылкі, аднавіць няправільна зняты з работы зняслаўленых, зганьбаваных настаўнікаў.

Вялікія і ганаровыя задачы совецкага настаўніцтва ў справе палітычнага выхавання совецкіх дзяцей. Праводзячы атэстацыю, выпраўляючы дапушчаныя памылкі, неабходна па-большэвіцку ўзяцца за ўмацаванне выхаваўчай работы ў нашай школе, зрабіць кожнага настаўніка адказным за выхаванне дзяцей, зрабіць кожную школу ачагом комуністычнага выхавання.

ЗВАРОТ ДА ІСПАНСКІХ ПРАЦОЎНЫХ

БАРСЕЛОНА, 13 лютага. (БЕЛТА). Іспанская комуністычная, социялістычная партыі, аб'яднаная социялістычная партыя Каталоніі, Выканаўчы Камітэт Усеагульнага рабочага саюза, а таксама Усеагульны Рабочы Саюз Каталоніі апублікавалі сумесны зварот да іспанскіх працоўных. Указваючы на тое, што іспанскі народ праяўляе гераізм у барацьбе за сваю незалежнасць, свае рэволюцыйнае будучае і социяльны прагрэс, зварот заклікае антыфашыстаў да напружання ўсіх сваіх сіл для дасягнення перамогі над ворагам.

Зварот падкрэслівае далей, што ў галіне прамысловасці яшчэ не дасягнуты неабходныя поспехі і што прамысловасць не вырабляе пакуль яшчэ ўсяго таго, што можа вырабляць краіна. Лозунгам усіх працоўных, гаворыцца ў звароце, павінна быць павелічэнне прадукцыі прамысловасці, якая павінна расці шпаркімі тэмпамі, бо ад гэтага ў значнай меры залежаць поспехі на франтах. Зварот патрабуе, каб на заводах былі ўстаноўлены ўдарныя тэмпы працы. У звароце ўказваецца далей, што ўрад мае намер устанавіць адрозненні для добра працуючых, як гэта зроблена ў адносінах герояў на франтах вайны.

У звароце падкрэсліваецца таксама, што харчовае становішча ў краіне будзе палепшана шляхам стараннага размеркавання прадуктаў. Для гэтага неабходна, каб кожны завод і майстэрня стварылі спажывецкія кааператывы і сталовыя. Барацьба са спекулянтамі павінна весціся па ўсёй суровасці закона.

Зварот заклікае сялян павялічыць і палепшыць сельскагаспадарчую прадукцыю.

У заключэнне выказваецца ўпэўненасць, што працоўныя рэспубліканскай Іспаніі падвояць свае намаганні для таго, каб машыны рэспубліканскай прамысловасці атрымлівалі над ворагам такія-ж перамогі, як штыкі рэспубліканскіх байцоў.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У сектары Універсітэцкага гарадка рэспубліканскія войскі ўзарвалі міну, закладзеную пад сельскагаспадарчай школай. Выбух разбурыў будынак школы і прылягаючыя да яе ўмацаванні мяцежнікаў, нанёсшы апошнім унушальныя страты.

ПАУДНЁВЫ ФРОНТ

Атакі мяцежнікаў на пазіцыі рэспубліканскіх войск у раёне ўзвышшаў Ла Нава і Пуэрто дэль Каміно адбіты.

У сектары Грэнады, дзе мяцежнікі на працягу апошняга часу прабавалі атакаваць рэспубліканскія войскі, наступіла заціша. Мяцежнікі панеслі на гэтым участку моцнае паражэнне. Два табары мараканскіх войск, якія камандаванне мяцежнікаў кінула на гэты ўчастак з мэтай адбіць страчаныя пазіцыі, былі цалкам знішчаны. На месцы бою асталіся шматлікія трупы мараканцаў.

Перабежчыкі з лагера мяцежнікаў пацвярджаюць глыбокую дэмаралізацыю, пануючую ў войсках мяцежнікаў, у сувязі з цяжкімі стратамі, панесенымі імі ў сектары Грэнады. Як указваюць перабежчыкі, рад афіцэраў мяцежнікаў, якія кіравалі аперацыямі на гэтым участку, расстрэляны.

На астатніх франтах — заціша.

***

ПАРЫЖ, 11 лютага. (БЕЛТА). Паводле паведамлення агенцтва Эспань, у Барселону ў бліжэйшыя дні прыбудзе вядомы амерыканскі лётчык Ліндберг для вывучэння арганізацыі рэспубліканскай авіяцыі.

МІЖНАРОДНЫ МІТЫНГ ДАПАМОГІ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 11 лютага. (БЕЛТА). У зале «Мюцыалітэ» ў Парыжы адбыўся мітынг дапамогі рэспубліканскай Іспаніі, арганізаваны міжнародным камітэтам дапамогі рэспубліканскай Іспаніі. На мітынгу прысутнічалі члены англійскага, французскага, бельгійскага, балгарскага, югаслаўскага парламентаў і прадстаўнікі Скандынаўскіх краін, якія прысутнічалі на пасяджэнні іспанскіх картэсаў (парламента). Пасол Іспаніі ў Парыжы Оссорыо Гальярдо, дэпутаты іспанскага парламента Маргарыта Нелькен, Мартынес Баррыо, Марселіно Доминго і іншыя прадстаўнікі рэспубліканскай Іспаніі былі сустрэты апладысментамі сабраўшыхся. Удзельнікі мітынга патрабавалі адкрыцця граніцы паміж Францыяй і Іспаніяй.

ЗАМЯТАЮЦЬ СЛЯДЫ...

ВЕНА, 13 лютага. (БЕЛТА). Ужо пры новым румынскім урадзе друк прадаўжае распаўсюджваць хлуслівыя і нават самыя фантастычныя весткі ў сувязі з пахішчэннем фашысцкімі бандамі тав. Буценка. У той-жа час афіцыяльныя заявы совецкага паўпрэдства ў Бухарэсце цэнзурай, як відаць, не прапускаюцца. Друк са спасыланнем на судовага следчага абвяргае нават усім вядомы факт маніфестацыі «ланчыераў» (румынскіх фашыстаў) перад памяшканнем супрацоўнікаў паўпрэдства, аб чым паўпрэдства афіцыяльна паведаміла міністэрства замежных спраў неўзабаве пасля маніфестацыі. Разам з тым робяцца спробы падвергнуць сумненню асобу тав. Буценка. Яго называюць то камандзірам Чырвонай Арміі, то лётчыкам. Усё больш высвятляецца дачыненне да ўсёй гэтай справы, асабліва да інспірацыі друку па скажэнню фактаў германскай, італьянскай і польскай місіі. Незвычайную актыўнасць па кіраўніцтву дзейнасцю румынскіх паліцэйскіх рэпарцёраў праяўляе карэспандэнт італьянскага агенцтва «Стэфані» Трандафіло, які ў Рым перадае вымыслы па справе знікнення тав. Буценка. Пускалася, між іншым, версія аб тым, што тав. Буценка паехаў на совецкім параходзе «Катаяма», які, як цяпер устаноўлена, ушоў з румынскага порта яшчэ 2 лютага, г. зн. за чатыры дні да пахішчэння т. Буценка. Усе гэтыя манеўры маюць адзінай мэтай замесці сляды і заблытаць следства, і таму не прыходзіцца здзіўляцца, што да гэтага часу нібы не ўдалося напасці на след пахішчальнікаў, хаця румынскім уладам яны бясспрэчна добра вядомы.

***

ЛОНДАН, 13 лютага. (БЕЛТА). Па словах бухарэсцкага карэспандэнта агенцтва Брытыш Юнайтэд Прэс, кіраўнік румынскай фашысцкай арганізацыі «Жалезнай гвардыі» Кодрэану распарадзіўся знішчыць усе запісы і дакументы, якія ёсць у гэтай арганізацыі.

СТАНОВІШЧА Ў РУМЫНІІ

БУХАРЭСТ, 12 лютага. (БЕЛТА). Па ўсёй Румыніі павятовымі прэфектамі назначаны начальнікі мясцовых гарнізонаў. Каралеўскім дэкрэтам уводзіцца асаднае становішча ва ўсёй краіне.

Артыкулы 2 і 4 дэкрэта прадастаўляюць неабмежаваную ўладу ваеннаму камандаванню. Падрыхтоўваецца роспуск палітычных партый і іншых грамадскіх арганізацый. Выбары ў парламент адменены.

У адносінах канстытуцыі зварот караля да народу гаворыць: «Новы ўрад апалітызіруе адміністратыўнае і гаспадарчае жыццё краіны, зробіць канстытуцыйныя змены ў адпаведнасці з новымі патрэбамі краіны і шчырымі імкненнямі Румыніі».

Цяперашні ўрад патрыярха Мірона Крыстэа ў журналісцкіх і дыпламатычных колах расцэньваецца як кароткачасовы ўрад асабістай дыктатуры караля, фактычна ўзначальваемы Татарэску. Новы ўрад не мае пад сабой ніякай базы, тым больш, што самая шматлікая палітычная партыя нацыянал-цараністаў (сялянская партыя) ва ўрадзе не прадстаўлена.

***

БУХАРЭСТ, 11 лютага. (БЕЛТА). Румынскае тэлеграфнае агенцтва перадае прамову главы ўрада патрыярха Мірона Крыстэа ў часе прынясення прысягі. У прамове ён заявіў, што «ўрад хоча ўстанавіць парадак і спакой унутры краіны і ўмацаваць давер'е, у якім мы адчуваем вялікую патрэбу, з боку нашых саюзнікаў і ўсіх суседніх дзяржаў, з якімі мы павінны жыць у добрай згодзе і ўмацоўваць, па меры магчымасці, дружбу ў інтарэсах усеагульнага міру».

НА ПАСЯДЖЭННІ „КАМІТЭТА АБАРОНЫ ПОЛЬШЧЫ"

ВАРШАВА, 12 лютага. (БЕЛТА). Паводле паведамлення польскага тэлеграфнага агенцтва, у Варшаве адбылося першае пасяджэнне «Камітэта абароны Польскай рэспублікі», устаноўленага дэкрэтам прэзідэнта рэспублікі ад 9 мая 1936 г. У пасяджэнні прынялі ўдзел: прэзідэнт рэспублікі, у якасці старшыні, маршал Рыдз-Сміглы, прэм'ер Славой-Складкоўскі, міністр замежных спраў Бек, а таксама міністр фінансаў, ваенны міністр, міністр прамысловасці і гандлю, міністр сельскай гаспадаркі, другі віцэ-міністр ваенных спраў генерал Літвіновіч і намеснік начальніка генеральнага штаба.

На пасяджэнні камітэта абмяркоўваліся гаспадарчыя пытанні, «звязаныя з падрыхтоўкай абароны краіны», у прыватнасці, пытанне аб урэгуляванні харчовага снабжэння і снабжэння сыравінай.

Камітэт пастанавіў канцэнтраваць усе пытанні харчовага снабжэння ў міністэрстве сельскай гаспадаркі і даручыць кіраванне гэтым ведамствам віцэ-міністру па справах харчовага снабжэння. Апрача таго, камітэт пастанавіў каардынаваць усе работы па стварэнню ў Польшчы сыравіннай базы здольнай задаволіць усе патрэбы польскай прамысловасці, у прыватнасці, патрэбы ваеннай прамысловасці.

ПРАТЭСТ ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 12 лютага. (БЕЛТА). Палітбюро ЦК комуністычнай партыі Францыі, у сувязі з аслабаненнем аднаго кіраўнікоў фашысцкіх змоўшчыкаў генерала Дзюсеньера, апублікавала пагрозлівае, у якім з абурэннем пратэстуе супроць патуранняў, якімі сустракаецца кіраўнік фашысцкіх змоўшчыкаў ва Францыі. Палітбюро патрэбуе, каб урад без прамаруджання заключыў яго ў турму. Калі гэта не будзе зроблена, гаворыцца ў паведамленні, французскі народ будзе расцэньваць меру, прадпрынятую ў адносінах Дзюсеньера, як паказальнік слабасці і цярплівасці ў адносінах падпальшчыкаў грамадзянскай вайны.

МАГУТНАЯ АНТЫФАШЫСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 12 лютага. (БЕЛТА). У адзнаку памяці французскіх рабочых, забітых у дні барацьбы супроць фашысцкага выступлення ў лютым 1934 года, і ў адзнаку перамогі народнага фронта сёння ў Парыжы на плошчы Рэспублікі, па закліку комуністычнай партыі і іншых арганізацый народнага антыфашысцкага фронта, адбылася шматлюдная дэманстрацыя-шэсце. Колькасць удзельнікаў дэманстрацыі выражаецца сотнямі тысяч чалавек. Шэсце прадаўжалася звыш трох гадзін. Дэманстрацыя праходзіла ў абстаноўцы вялікага ўздыму. Дэманстранты абвяшчалі лозунгі: «Патрабуем сапраўднага роспуску фашысцкіх ліг!», «Дзюсеньёра — у турму!», «Адкрыйце франка-іспанскую граніцу!», «За адзінства міжнароднага профруху!» і т. д.

Група комсамольцаў, вылучаных на палітработу памочнікаў палітрукаў часці, дзе камісарам тав. Жданаў. **На здымку:** у першым радзе (злева направа) тт. **М. К. Ксенафонтаў, Т. В. Яраслаўкін;** у другім радзе — тт. **С. І. Брынёў, А. В. Мосін і В. О. Скарабагатаў.** Фото С. Грына.

НА ДРЭЙФУЮЧАЙ СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС"

Па вестках Галоўпаўночмаршляху, каардынаты дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс» у 12 гадзін 30 мінут 12 лютага былі наступныя: 71 градус 37 мінут паўночнай шыраты і 20 градусаў 10 мінут заходняй даўгаты.

(БЕЛТА).

ПАПАНІНЦЫ БАЧЫЛІ ПРАМЕННІ ПРАЖЭКТАРА „ТАЙМЫРА"

БОРТ «ТАЙМЫРА», 12 лютага. 23 гадзіны (Радыё). Часта Эрнст Крэнкель радуе нас сваімі паведамленнямі. «Ноччу бачылі ваш пражэктар, днём наглядалі дым «Таймыра». І, нарэшце, ён малніраваў на карабль сенсацыю: «У ваш бок галопам пабег мядзведзь».

Толькі што правялі светавую гутарку з папанінцамі. Як умовіліся загадзя з Крэнкелем, у 22 гадзіны мы пачалі даваць у напрамку лагера сігналы пражэктарам. У адказ з боку лагера Папаніна нам было падана некалькі ўспышак магнія. Святло ўспышак было ясна відаць на паўночным захадзе ад нашага карабля. Пасля светавой гутаркі мы па радыё з папанінцамі пацвердзілі адзін аднаму сігналы.

Дагаварыліся з лагерам, што 13 лютага яго жыхары будуць даваць нам дымавыя сігналы. Крэнкель заявіў, што калі мы пашлем да іх самалёты, то на працягу чатырох гадзін папанінцы падрыхтуюць для іх аэрадром. На жаль, характар ільду не дазваляе пакуль выкарыстаць самалёты. На ўсім нашым шляху мы не бачылі крыг, годных для пабудовы аэрадрома. Цэлы дзень «Таймыр» ішоў у цяжкім шматгадовым ільду.

К вечару падзьмуў свежы вецер і скаваў лёд. Стаім, чакаючы яго разражэння. Нашы каардынаты — 71 градус 30 мінут паўночнай шыраты і 18 градусаў 14 мінут заходняй даўгаты. Зараз дзме паўночна-паўночна-заходні вецер сілай у 3 балы. Тэмпература паветра мінус 22 градусы. Глыбіня дна каля 200 метраў.

Кіраўнік экспедыцыі на «Таймыры»
ОСТАЛЬЦЭУ.

„МЫ ПЕРАНЯСЕМ ІХ НА РУКАХ"

БОРТ «ТАЙМЫРА», 12 лютага. 23 гадзіны 50 мінут (Радыё). Чуем па радыё з Масквы «Апошнія весткі» для Папаніна. Заўтра раніцою запытаем Івана Дзмітрыевіча (Папаніна), калі ён «весткі» не чуў, паўторым. У сувязі з нарастаючымі падзеямі дня, не гледзячы на страшэнную стомленасць усяго экіпажа, на караблі пануе незвычайны ўздым. Людзі просяць, не гледзячы на дрэннае надвор'е, пусціць іх пешшу да лагера папанінцаў.

Каманда заявіла мне: «Начальнік, мы перанясем на руках не толькі гераічную чацвёрку, але падбярём да вінціка ўсю іх маёмасць».

Прышлося загадаць вольным ад вахты класціся спаць. Заўтра прадстаіць цяжкі дзень.

Кіраўнік экспедыцыі на «Таймыры»
ОСТАЛЬЦЭУ.

МЕХАНІЗМЫ „ТАЙМЫРА" ПРАЦУЮЦЬ БЕЗДАКОРНА

БОРТ «ТАЙМЫРА», 13 лютага. 00 гадзін 50 мінут (Радыё). Стаім у цяжкім васьмібальным ільду. Сёння будзем рухацца наперад, узрываючы лёд аманалам. Маем намер падыйсці ўшчыльную да крыгі.

Механізмы «Таймыра» працуюць бездакорна і безадмоўна. 12 лютага прайшлі ў цяжкім ільду каля 20 міль.

Зараз стаіць ясная, лунная, марозная ноч. Вольныя ад вахты людзі адпачываюць. Прама па носе «Таймыра» бачны прыгожыя высокія берагі Грэнландыі. Папанінцы трымаюць з намі непарыўную сувязь.

Кіраўнік экспедыцыі на «Таймыры»
ОСТАЛЬЦЭУ.

ДА КРЫГІ ПАПАНІНА

БОРТ «МУРМАНА», 12 лютага, 18 гадзін 05 мінут. (Радыё) Ідзем курсам на Грэнландыю. Сёння ў 10 гадзін раніцы перасяклі нулявы градус і ўвайшлі ў заходняе поўшар'е. Ноччу мяркуем увайсці ў лёд.

***

Капітан «Мурманца» тав. Ульянаў паведаміў 12 лютага ў 24 гадзіны месцазнаходжанне карабля. «Мурманец» знаходзіўся на 69 градусе 40 мінут паўночнай шыраты і 19 градусаў 42 мінуты заходняй даўгаты. Вецер, хваля. Тэмпература мінус 6 градусаў. Карабль ідзе ў буйна-бітым таросістым ільду. Зыб непакоіць судно.

Тав. Ульянаў паведаміў таксама аб лёдавай абстаноўцы вакол «Мурманца». Уся бачная з карабля паверхня пакрыта таросістым ільдом таўшчынёю больш трох метраў, дрэйфуючым на паўднёвы захад з хуткасцю менш 0,5 міль ў гадзіну.

***

БОРТ «ЕРМАКА», 13 лютага, 9 гадзін 20 мінут. (Радыё). Каардынаты ледакола 60 градусаў паўночнай шыраты і 27 градусаў 06 мінут усходняй даўгаты. Суцэльная воблачнасць, дымка. Дуе паўночна-паўночна-ўсходні вецер сілай у 2 балы, тэмпература мінус 2 градусы.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ФІНАНСАВАННІ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ, КАМБАЙНАЎ І СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН МТС

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Існуючае дзяленне рамонту трактараў і камбайнаў на капітальны, сярэдні і бягучы не стварае неабходных умоў для ўважлівага тэхнічнага догляду за імі і не спрыяе ўтрымаанню машынна-трактарнага парка ў працаздольным становішчы.

Дзейнічаючая сістэма фінансавання не заахвочвае своечасовага бягучага рамонту, які з'яўляецца асноўным, а штурхае кіраўнікоў МТС на безгаспадарчае скарыстанне машынна-трактарнага парка і прыводзіць да штогоднага перапавелічэння капітальнага рамонту трактараў і камбайнаў.

У інтарэсах далейшага арганізацыйнага ўмацавання МТС і карэннага палепшання скарыстання машынна-трактарнага парка, Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

1. Адмяніць існуючую практыку дзялення рамонту трактараў і камбайнаў на тры віды — капітальны, сярэдні і бягучы, устанавіўшы для трактараў і камбайнаў два віды рамонту — бягучы і капітальны, а для ўсіх астатніх сельскагаспадарчых машын — толькі бягучы.

2. Адмяніць існуючы парадак фінансавання рамонту трактараў і камбайнаў, пры якім аб'ём рамонту ўстанаўляўся без належнага ўліку фактычна выкананых работ.

Устанавіць, што ў распараджэнні кожнай МТС ствараюцца мэтавыя грашовыя фонды для правядзення бягучага і капітальнага рамонту, якія пад страхам крымінальнай адказнасці не могуць быць скарыстаны на іншыя патрэбы, і, значыць, скарыстоўваюцца толькі па прамому назначэнню, г. зн. сродкі з фонда бягучага рамонту — на бягучы рамонт, а з фонда капітальнага рамонту — на капітальны рамонт.

3. Устанавіць, што грашовыя фонды бягучага і капітальнага рамонту ствараюцца шляхам адлічэння з кожнага рахунка праведзеных машынна-трактарнымі станцыямі работ па зонах у размерах, вызначаных Соўнаркомам Саюза ССР.

4. Праводзіць пералічэнні сродкаў у фонды бягучага і капітальнага рамонту з бюджэтнага рахунка рамонту на асобыя бягучыя рахункі МТС у Дзяржбанку для бягучага і капітальнага рамонту адзін раз у месяц на падставе копій актаў праўленняў калгасаў на прынятыя ад МТС работы.

Рахункі МТС па фондах бягучага і капітальнага рамонту ў канцы бюджэтнага года закрыццю не належаць.

5. Дазволіць Наркамзему СССР стварыць цэнтралізаваны манеўраны фонд у размеры 5 проц. ад сум, адлічаных МТС на рамонт.

Выдаткаванне сродкаў з цэнтралізаванага 5-процантнага фонда на рамонт трактараў і камбайнаў Наркамзему СССР рабіць толькі з дазволу Эканомсовета пры СНК СССР.

6. Устанавіць, што капітальны рамонт, а таксама бягучы, які робіцца па-за МТС, аплачваюцца на аснове дагавораў МТС з машынна-трактарнымі майстэрнямі і рамонтнымі заводамі па ўстаноўленых прэйскурантных расцэнках.

Агульныя выдаткі па рамонту не павінны перавышаць створаных фондаў. Пералічэнне сродкаў з аднаго фонда ў другі не дапускаецца.

7. Устанавіць, што капітальны рамонт павінен рабіцца па выкананні (у пераводзе ўсіх работ на ўстаноўленае ўмоўнае ворыва): для трактараў ЧТЗ — 6.500 гектараў, для трактараў ХТЗ —СТЗ — 1.800 гектараў, для трактараў «Універсал» — 1.400 гектараў; для камбайнаў: «Комунар» — 1.300 гектараў, «Сталінец» — 1.700 гектараў убранай плошчы.

8. Для заахвочвання ўважлівага тэхнічнага догляду за трактарамі, камбайнамі і іншымі сельскагаспадарчымі машынамі і ўтрымання іх у добрым працаздольным становішчы ўстанавіць наступны парадак прэміравання:

а) па сканчэнні сельскагаспадарчых работ спецыяльная камісія пад кіраўніцтвам старшага механіка МТС з удзелам спецыялістаў па рамонту праводзіць тэхнічную прыёмку трактараў, камбайнаў і іншых сельскагаспадарчых машын і вызначае іх тэхнічнае становішча;

б) трактарысты, якія выканалі ўстаноўленыя для іх планы работ і здалі прымацаваныя да іх машыны ў добрым тэхнічным становішчы, атрымліваюць ад МТС прэмію ў размеры 40 проц. ад эканоміі сродкаў, адлічаных на бягучы рамонт замацаванага за імі трактара;

в) брыгадзір трактарнай брыгады, забяспечыўшы выкананне плана трактарных работ і добрае тэхнічнае становішча трактараў сваёй брыгады, атрымлівае ад МТС прэмію ў размеры 10 проц., а яго памочнік — у размеры 7 проц. ад агульнай сумы эканоміі сродкаў, адлічаных на бягучы рамонт трактараў брыгады;

г) механік па сельскагаспадарчых машынах пры выкананні плана работ па МТС у цэлым атрымлівае прэмію ў размеры 10 проц. ад эканоміі сродкаў, адлічаных на рамонт сельскагаспадарчых машын;

д) старшы механік МТС пры выкананні плана трактарных работ па МТС у цэлым атрымлівае прэмію ў размеры 20 проц. ад агульнай сумы эканоміі сродкаў, належачых на капітальны рамонт трактараў, якія падлягаюць рамонту ў даным годзе.

9. Прэміі трактарыстам, брыгадзірам, іх памочнікам і механікам сельскагаспадарчых машын зацвярджаюцца дырэктарамі МТС па прадстаўленню старшых механікаў. Дзве трэці зацверджанай прэміі выдаюцца па сканчэнні сельскагаспадарчага года і адна трэць — па сканчэнні рамонту.

10. Па прадстаўленню дырэктара МТС прэмія старшаму механіку зацвярджаецца начальнікам край (абл.)Заабо наркомам земляробства рэспублікі, якая не мае абласнога дзялення. Прэмія выдаецца па сканчэнні зімовага рамонту трактараў і прыёмкі іх спецыяльнай камісіяй пад старшынствам дырэктара МТС, з абавязковым удзелам брыгадзіра трактарнай брыгады, за якой замацоўваюцца вышаўшыя з рамонту трактары.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Кіраўнік Спраў СНК Саюза ССР
Н. ПЕТРУНІЧЭУ.

Масква, Крэмль,
11 лютага 1938 г.

Інструктар прапаганды Н-скай вайсковай часці тав. **Плаксін** інструктуе групаваў палітзаняткаў па гісторыі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.
Фото Я. Салавейчыка.

ЗАКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ МАЗЫРСКАГА АКРУГКОМА ПАРТЫІ

11 лютага кончыў сваю работу пленум Мазырскага акругкома партыі. У рабоце пленума прымалі ўдзел сакратары райкомаў, старшыні райвыканкомаў, дырэктары МТС і сакратары парткомаў партарганізацый горада. Даклад аб выкананні партарганізацыямі акругі гістарычных рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) зрабіў выконваючы абавязкі сакратара акругкома партыі тав. Маркін.

У спрэчках выказалася 18 чалавек. Таварышы аднадушна ўхвалялі рашэнні Пленума ЦК ВКП(б). Выступаўшыя ўскрывалі памылкі, дапушчаныя парторганізацыямі пры выключэнні комуністаў з партыі, рэзка крытыкавалі акругком і райкомы за марудны разбор апеляцый няправільна выключаных з партыі. У Даманавіцкай раённай партыйнай арганізацыі за некалькі месяцаў былі выключаны 34 комуністы як ворагі народа і іх пасобнікі. Пры выясненні аказалася, што партыйнасць гэтых людзей вырашалася без неабходнай праверкі кампраметуючых матэрыялаў.

У райкомах акругі ляжыць без усякага руху каля ста апеляцый выключаных. Нават пасля рашэння студзеньскага Пленума райкомы разабралі толькі 40 апеляцый. Лельчыцкі райком разабраў адну апеляцыю, Даманавіцкі — 3, а ў Мазырскім райкоме марынуецца больш 40 апеляцый.

Сакратар Тураўскага райкома партыі тав. Бандарэнка прывёў абураючы прыклад, калі былое кіраўніцтва раёна выключыла з партыі і наладзіла паказальны суд над тав. Вілешынам. Зараз устаноўлена, што такая расправа ўчынена ў мэтах помсты. Тав. Вілешын працаваў старшынёй сельпо і адмовіўся адпускаць жульніцкім парадкам некаторыя тавары жонкам начальства.

У рабоце пленума прымаў удзел член Бюро ЦК КП(б)Б тав. Цвяткоў, які ў сваім выступленні рэзка крытыкаваў акругком партыі за нездавальняючую работу па выпраўленню дапушчаных памылак пры выключэнні комуністаў з партыі, і заклікаў членаў і кандыдатаў партыі па-большэвіцку выкананць гістарычныя рашэнні Пленума ЦК ВКП(б).

ВЫВУЧАЦЬ З ХАТНІМІ ГАСПАДЫНЯМІ МАТЭРЫЯЛЫ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ВІЦЕБСК. (**Кар. «Звязды»**). Первічная партыйная арганізацыя фабрыкі імя Клары Цэткін разгарнула палітычную работу сярод працоўных былога выбарчага ўчастка. Па кватэрах у хатніх гаспадынь арганізаваны гурткі, у якіх займаецца 50 жанчын. Агітатары вывучаюць з слухачамі матэрыялы Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Гурткамі кіруюць вылучаныя парткомам актывісты выбарчай кампаніі, комуністы і комсамольцы — агітатары тт. Зволкін, Эпштэйн, Крэйнін і Сувальская.

НЕПАРТЫЙНЫЯ БОЛЬШЭВІКІ УСТУПАЮЦЬ У ПАРТЫЮ

КРЫЧАЎ. Партыйная арганізацыя за апошні месяц прыняла ў рады партыі 6 чалавек. У кандыдаты партыі прыняты таварышы Макарэнка С. П. — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, трактарыст ільнаперабільшчык; Кухарэнка В. К.—стахановец-трактарыст МТС; Сярожкін Н. В.—ініцыятар стаханаўскага руху на Крычаўскім цэментным заводзе, член ЦВК БССР.

Тав. Дубасаў Е. К. і Мядзвецкі І. Т. прыняты райкомам у члены партыі.

РАЗГЛЯДАЕМ АПЕЛЯЦЫІ ВЫКЛЮЧАНЫХ

Партыйныя арганізацыі Сталінскага горрайкома (г. Менск), праводзячы вялікую работу па ачышчэнню сваіх радоў ад трацкісцка-бухарынскіх і нацыяналістычных агентаў фашызма — ворагаў народа, дапускалі грубыя памылкі ў адносінах вырашэння пытання аб партыйнасці асобных членаў і кандыдатаў партыі. Не гледзячы на неаднаразовыя папярэджанні ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна, партыйныя арганізацыі і райком падыходзілі да разбору раду партыйных спраў павярхоўна, лёгкадумна. Некаторых таварышаў выключылі з партыі без дастатковай праверкі кампраметуючых матэрыялаў, абзывалі іх ворагамі, не маючы ніякай на гэта падставы, пазбаўлялі работы і т. д.

Первічная партыйная арганізацыя Ушасдора выключыла з партыі т. Горфінкеля. Паданыя заявы абвінавачвалі яго ў сувязях з ворагамі народа, калі ён працаваў старшынёй местсовета і намеснікам старшыні РВК ў Дзержынску. Бюро райкома, разглядаючы пытанне аб тав. Горфінкелю ў лістападзе 1937 года, парашыла дадаткова даследаваць матэрыял.

Аднак, гэта не перашкодзіла самастрахоўшчыкам з первічнай партыйнай арганізацыі Радыёкамітэта выключыць з партыі і зняць з работы жонку тав. Горфінкеля за сувязь з сваім мужам. Тав. Горфінкель рашэннем бюро адноўлен у партыі і ўказана партыйнай арганізацыі на несур'ёзны, безадказны падыход да вырашэння яго партыйнай справы.

Член партыі тав. Кункін быў запрошан на вечарынку, дзе таксама прысутнічаў выкрыты зараз трацкіст, якога ён ведаў па сумеснай рабоце на мясакамбінаце. Пачынаючы з 1936 года, бесперапынна ставілася пытанне аб партыйнасці тав. Кункіна па адных і тых-жа матэрыялах абвінавачання. Вясной 1937 года партарганізацыя мясакамбіната абвясціла тав. Кункіну суровую вымову. У апошні час ён працаваў на асфальта-бетонавым заводзе. Па водгуках партарганізацыі і дырэкцыі, ён добра выконваў свае абавязкі. Перастрахоўшчыкі не мірыліся з такім становішчам і ў парадку паказной пільнасці партарганізацыя рашыла перагледзець партыйную справу тав. Кункіна. Яго выключылі з радоў партыі і знялі з работы. Рашэннем бюро райкома тав. Кункін адноўлен у партыі.

На менскай гарадской канферэнцыі комсамола быў пазбаўлен дэлегацкага мандата і выключан з комсамола, будучы членам партыі, былы сакратар гаркома комсамола тав. Фадзееў. Матывам абвінавачання паслужыла работа тав. Фадзеева сумесна з ворагамі народа, якія арудавалі ў ЦК ЛКСМБ. Первічная партарганізацыя гаркома на падставе гэтых матэрыялаў выключыла тав. Фадзеева з партыі. Райком грунтоўна правяраў высунутыя супроць яго абвінавачанні.

Тав. Фадзееў сам рабочы, бацька стахановец-рабочы, комуніст; браты і сёстры комсамольцы. На ўсіх работах, дзе тав. Фадзееў працаваў раней, ён апраўдваў сябе. Будучы другім сакратаром Менскага гаркома комсамола, тав. Фадзееў дапусціў грубыя палітычныя памылкі. Аднак, за гэта нельга было выключаць з радоў партыі, і бюро райкома аднавіла тав. Фадзеева ў партыі, вынесшы яму партыйнае спагнанне.

Пры разглядзе партыйных спраў выключаных з партыі таварышаў існуе яшчэ недапушчальная маруднасць. Первічныя парторганізацыі перагледзелі толькі 9 апеляцый выключаных з партыі. Усе таварышы адноўлены ў партыі. Бюро райкома партыі разгледзела 15 апеляцый, з іх 13 таварышаў адноўлены ў партыі. У райкоме ёсць 58 неразгледжаных апеляцый. Партыйныя следчыя глыбока вывучаюць справу кожнага выключанага, каб выносіць правільныя, большэвіцкія рашэнні.

ЦО нашай партыі «Правда» ў перадавым артыкуле ад 3 лютага ўсім правільна заклікала комуністаў: «Трэба вывесці на чыстую ваду ўсіх паклёпнікаў, кар'ерыстаў-комуністаў, нельга пакідаць беспакаранымі іх брудныя ўчынкі. Справа гонару партыйных кіраўнікоў — стварыць у арганізацыі атмасферу сапраўднай большэвіцкай пільнасці, каб нікому не было павадна паклёпнічаць на чэсных членаў партыі».

А такія комуністы яшчэ ёсць у нас у арганізацыі. Вось, напрыклад, на партсходзе завода імя Варашылава пры абмеркаванні справаздачы парткома былы рэдактар заводскай газеты тав. Левін, які знят з пасады рэдактара за правал работы, выступіў з яўным паклёпам адразу на трох членаў парткома. Аднаго ён назваў двурушнікам і падляцом, другога ўдзельнікам антыпартыйнай групоўкі супроць газеты, трэцяга зажымшчыкам крытыкі. Двум астатнім членам парткома хаця і не мог выказаць сваё недавер'е, усё-ж патрабаваў неадкладнага роспуску парткома. Сход партарганізацыі даў рашучы адпор паклёпніцкім выпадам Левіна. Тады ён выступіў з абвінавачаннем усіх комуністаў у няздольнасці іх выконваць дырэктывы партыі і рашэнні студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

У райком партыі на былога сакратара Гомельскага гаркома комсамола тав. Абугава даслалі матэрыял аб тым, што ён быў звязан з ворагам народа. На падставе гэтых-жа матэрыялаў тав. Абугаў быў знят з работы, і яму выразілі палітычнае недавер'е.

Пры сур'ёзнай праверцы «кампраметуючых» матэрыялаў на тав. Абугава ўстаноўлена, што ўсе факты былі надуманы і зараз іх аўтар — паклёпнік Чаушнік ад іх адмовіўся, бо як ён сам заявіў: «яны былі ілжывыя». Райком партыі спыніў высвятленне партыйнай справы тав. Абугава. Паклёпніка Чаушніка патрэбна прыцягнуць да суровай адказнасці за зняважанне чэсных людзей.

У партарганізацыі інстытута гісторыі партыі пры разглядзе справы тав. Маневіча комуніст Валадкевіч паклёпніцка абзываў Маневіча «здраднікам радзімы», «заўзятым ворагам народа», не маючы на гэта ніякіх падстаў. У Акадэміі навук перастрахоўшчыкі знялі з работы ў друкарні кваліфікаванага лінатыпіста тав. Петухоўскага, як выключанага з партыі. На працягу 6 месяцаў тав. Петухоўскі хадзіў без работы. Патрабавалася спецыяльнае рашэнне бюро райкома, каб аднавіць яго на рабоце. Такія факты мелі месца на мясакамбінаце, асфальта-бетонавым заводзе, у горсовеце і іншых первічных партыйных арганізацыях.

Партыя і таварыш Сталін вучаць нас, комуністаў, уважліва і чула падыходзіць да кожнага члена партыі. Рэабілітоўваючы чэсных комуністаў, парторганізацыі абавязаны бязлітасна выкрываць кар'ерыстаў і перастрахоўшчыкаў, якія пад фальшывым сцягам «пільнасці» кампраметавалі чэсных комуністаў, гэтым самым стваралі вакол іх падазронасць і недавер'е, усялякімі спосабамі яны імкнуліся перабіць нашы большэвіцкія кадры. Да гэтых людзей не можа быць ніякай літасці. Наш абавязак вывесці іх на чыстую ваду, разглядаць іх дзеянні, як варожыя.

Партыйная арганізацыя Сталінскага горрайкома, выконваючы гістарычныя рашэнні студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), па-большэвіцку выправіць дапушчаныя памылкі пры выключэнні з партыі комуністаў, мабілізуе кожнага члена і кандыдата партыі на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці і на выкрыццё да канца замаскаваўшыхся ворагаў народа.

В. П. СМОЛЕР,
в. а. сакратара Сталінскага горрайкома партыі.

З ГІСТОРЫІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

ПЕРАМОГА СТАЛІНСКАГА СТРАТЭГІЧНАГА ПЛАНА

(Разгром армій Дзенікіна)

Восенню 1919 года Совецкая Расія перажывала надзвычай цяжкі перыяд. Яна была акружана з усіх бакоў вогненым кальцом контррэволюцыі. З поўдня наступалі белагвардзейскія полчышчы генерала Дзенікіна. На ўсходзе дзейнічалі арміі «вярхоўнага правіцеля» адмірала Калчака. На паўночным захадзе белагвардзейскі генерал Юдзеніч рваўся да чырвонага Піцера. На захадзе наступалі белапольскія легіёны.

Прайграўшы стаўку на Калчака, мацёрыя ваўкі Антанты ўскладалі ўсе надзеі на паход Дзенікіна. Узброеныя Антантай, апранутыя ў англійскія мундзіры, белагвардзейскія палкі імкліва наступалі на сталіцу краіны Совецтаў. Дзенікін марыў аб урачыстым уездзе на белым кані ў «Первопрестольную», аб малінавым звоне «сарака саракоў» Масквы. Белагвардзейшчына марыла аб лютай крывавай расправе з паўстаўшай «чэрнью». Полчышчы контррэволюцыі набліжаліся да Тулы. Нарастала пагроза для чырвонай сталіцы.

У гэты бязмерна-цяжкі момант грамадзянскай вайны, калі совецкая краіна была адрэзана ад усіх баз, калі пагражала небяспека заваяванням рэволюцыі, калі голад і холад панавалі ў жабрацкай краіне, вялікія геніі і стратэгі рэволюцыі Ленін і Сталін ні на мінуту не трацілі веру ў сілы рабочага класа, не трацілі бадзёрасці і ўпэўненасці ў перамозе. Патрабавалася жалезная воля і бясстрашнасць рэволюцыйных правадыроў, несакрушальная ўпэўненасць у творчыя сілы прапоўных і дар геніяльнага, мудрага прадбачання, каб не разгубіцца, не пасаваць перад труднасцямі, каб у надзвычай цяжкіх умовах каваць перамогу пролетарыята. Ленін і Сталін добра ведалі, што народ, прабуджаны Кастрычніцкай рэволюцыяй да новага жыцця, зламаць нельга, іх не палохалі грозныя адборныя палкі Дзенікіна, якія Уінстон Чэрчыль у той час англійскі ваенны міністр, з гонарам называў «маёй арміяй».

Ленін у кастрычніку 1919 года ў звароце да байцоў Чырвонай Арміі пісаў: «...Мы цвёрда ўпэўнены ў нашай перамозе над Юдзенічам і Дзенікіным. Не ўдасца ім аднавіць царскую і памешчыцкую ўладу. Не бываць гэтаму!»

Таварыша Сталіна, лепшага і адданейшага большэвіка-ленінца, партыя паставіла ў той грозны час на важнейшым і адказнейшым участку грамадзянскай вайны, у якасці члена Рэвваенсовета Паўднёвага фронта. Перад сваім назначэннем таварыш Сталін паставіў перад ЦК тры галоўныя пытанні: Троцкі не павінен ўмешвацца ў справы паўднёвага фронта; з фронта павінен быць адкліканы цэлы рад непрыгодных работнікаў; на паўднёвы фронт павінны быць адкамандыраваны новыя работнікі па выбару таварыша Сталіна. ЦК ВКП(б) прыняў гэтыя ўмовы. Таварыш Сталін катэгарычна адмовіўся ад старога стратэгічнага плана, распрацаванага ваенспецамі — любімцамі здрадніка Троцкага, плана, абяцаўшага новыя паражэнні, і ў спецыяльнай запісцы Леніну прапанаваў свой, новы, сапраўды геніяльны план:

«На днях Глаўком даў Шорыну дырэктыву аб наступленні на Новарасійск праз данскія стэпы па лініі, па якой, можа быць, і выгодна лятаць нашым авіятарам, але ўжо зусім немагчыма будзе брадзіць нашай пяхоце і артылерыі. Няма чаго і даказваць, што гэты сумазбродны (мяркуемы) паход у асяроддзі варожым нам, ва ўмовах абсалютнага бездарожжа, пагражае нам поўным крахам. Не цяжка зразумець, што гэты паход на казацкія станіцы, як гэта паказала нядаўняя практыка, можа толькі згуртаваць казакаў супроць нас вакол Дзенікіна для абароны сваіх станіц, можа толькі выставіць Дзенікіна выратавальнікам Дона, можа толькі стварыць армію казакаў для Дзенікіна, гэта значыць можа толькі ўзмацніць Дзенікіна. Іменна таму неабходна цяпер-жа, не трацячы часу, змяніць ужо адменены практыкай стары план, замяніўшы яго планам асноўнага ўдара праз Харкаў — Данецкі басейн на Растоў: па-першае, тут мы будзем мець асяроддзе не варожае, наадварот, сімпатызуючае нам, што палегчыць наша прасоўванне; па-другое, мы атрымліваем важнейшую чыгуначную сетку (данецкую) і асноўную артэрыю, харчуючую армію Дзенікіна — лінію Варонеж—Растоў...; па-трэцяе, гэтым прасоўваннем мы рассякаем армію Дзенікіна на дзве часткі, з іх добраахвотніцкую пакідаем на з'ядзенне Махно, а казацкія арміі ставім пад пагрозу заходу ім у тыл; па-чацвертае, мы атрымліваем магчымасць пасварыць казакаў з Дзенікіным, які (Дзенікін) у выпадку нашага паспяховага прасоўвання пастараецца перасунуць казацкія часці на захад, на што большасць казакаў не пойдзе...; па-пятае, мы атрымліваем вугаль, а Дзенікін аставецца без вугалю. З прыняццем гэтага плана нельга марудзіць... Карацей: стары, ужо адменены жыццём план ні ў якім выпадку не варта гальванізаваць, — гэта небяспечна для рэспублікі, гэта наверняка аблягчыць становішча Дзенікіна. Яго трэба замяніць другім планам. Акалічнасці і ўмовы не толькі наспелі для гэтага, але і загадна дыктуюць такую замену... Без гэтага мая работа на паўднёвым фронце становіцца бяссэнсоўнай, злачыннай, непатрэбнай, што дае мне права, або зярней, абавязвае мяне ўйсці куды ўгодна, хоць да чорта, толькі не аставацца на паўднёвым фронце. Ваш Сталін».

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) прыняў сталінскі стратэгічны план. Ленін прапанаваў палявому штабу неадкладна змяніць старыя дырэктывы.

Тав. К. Е. Варашылаў у сваёй кнізе «Сталін і Чырвоная Армія» піша, што ў ацэнцы напрамкаў наступлення яркасталіся асноўныя якасці таварыша Сталіна, як пролетарскага рэволюцыянера, як сапраўднага стратэга грамадзянскай вайны.

У канцы кастрычніка 1919 года план таварыша Сталіна пачаў ажыццяўляцца, і тым самым быў дасягнут рашаючы пералом у ходзе грамадзянскай вайны.

Паўднёвая контррэволюцыя наступала ў тыя дні па двух напрамках: на цэнтральным (Кромы—Орол), дзе дзейнічалі лепшыя дывізіі белай арміі — Драздоўская і Карнілаўская, і на Варонежскім, дзе наступала белагвардзейская конніца Мамантава і Шкуро.

У ноч на 25 кастрычніка член рэвваенсовета 14-й арміі тав. Орджанікідзе, які знаходзіўся пры Ударнай групе совецкіх войск, атрымаў указанні таварыша Сталіна — сканцэнтраваным ударам знішчыць лепшыя палкі Дзенікіна.

26 кастрычніка Ударная група і іншыя часці Чырвонай Арміі, папоўненыя комуністамі, узмоцненыя лепшымі камандзірамі, перайшлі ў энергічнае наступленне.

Белагвардзейскія палкі, абяскроўленыя ў папярэдніх упартых і доўгіх баях, пачалі адыходзіць ад Кром на поўдзень, на Курск—Харкаў. Левы фланг фронта Дзенікіна быў прарван.

У гэты час на Варонеж ударылі палкі конніцы Будзённага. Удар быў настолькі моцны, што белабандыцкі генерал Шкуро ўцёк у ванцы. Конныя палкі Будзённага пачалі праследванне праціўніка. Пад ст. Касторнай пацярпелі поўны разгром адборныя кавалерыйскія часці Мамантава і Шкуро. Варонежская і Касторненская аперацыі Чырвонай конніцы з'яўляцца непераўзыйдзенымі ўзорамі адвагі, мужнасці і гераізма. Легендарная конніца рэволюцыі паказала ўсяму свету на якія подвігі здольны вызвалены народ.

У сваіх успамінах аб нязвалым паходзе на Маскву генерал Дзенікін пісаў, што пасля гэтых паражэнняў ён страціў веру ў поспех пачатага паходу і аддаў загад аб агульным адступленні. Пачаўся новы этап барацьбы — бесперапыннае праследванне ворага аж да самага Азоўскага мора.

Адной з важнейшых умоў перамогі з'явілася арганізацыя Першай Коннай Арміі. Геніяльная мысль стварэння баявой рабоча-сялянскай конніцы належыла таварышу Сталіну. Зімой 1919 года ў раёне Вялікай Міхайлаўкі таварыш Сталін у суправаджэнні тт. Варашылава і Егорава наведаў Першую Конную. Таварыш Сталін пражыў у арміі некалькі дзён, заняўся арганізацыяй штаба палітаддзелаў, гутарыў з байцамі, знаёміўся з іх бытам, выступаў на мітынгах у часцях, натхняў рэволюцыйнай энергіяй і энтузіязмам чырвоных коннікаў.

Дзецішча таварыша Сталіна—Першая Конная Армія бліскуча апраўдала яго давер'е, яна пакрыла легендарнай неўвядаемай славай баявыя сцягі Чырвонай Арміі. Таварыш Сталін не раз гаварыў, што ў бліскучым кіраўніцтве таварышоў Варашылава і Будзённага баявымі аперацыямі Першай Конной класічна ўвасобіўся баявы саюз рабочага класа і рэволюцыйнага сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

Першая Конная з'явілася адной з асноўных і рашаючых сіл, прывёўшых да разгрому «добраахвотніцкай арміі» Дзенікіна.

10 студзеня 1920 г. паў апошні аплот дзенікіншчыны—Растоў-на-Дану, «последняя туча рассеянной бури» — ён быў узят ліхім налётам Першай Конной. Рэшткі войск паўднёвай контррэволюцыі выратаваліся бегствам у Крым. Міністры і генералы Дзенікіна ў паніцы садзіліся на караблі, каб шукаць ратунку пад крылышкам «саюзнікаў». План Антанты рухнуў.

Загад № 19 войскам Паўднёвага фронта, выданы пасля ўзяцця Растова, так гаворыць аб бліскучым шляху, пройдзеным Чырвонай Арміяй:

«Асноўная задача, даная войскам Паўднёвага фронта, — разгром добраахвотніцкай арміі праціўніка, авалоданне Данецкім басейнам і галоўным ачагом паўднёвай контррэволюцыі, Растовам, — выканана.

Наступаючы зімой па глыбокаму снегу і ў непагоду, пераносячы пакуты, доблесныя войскі фронта ў паўтара месяца прайшлі з упартымі баямі ад лініі Орла да берагоў Азоўскага мора звыш 700 вёрст. Добраахвотніцкая армія праціўніка, падмацаваная конніцай Мамантава, Шкуро, Улагая, разбіта, і астаткі яе бягуць па розных напрамках. Арміямі фронта захоплена звыш 40 тысяч палонных, 750 гармат, 1.130 кулямётаў, 23 бронепаязды, 11 танкаў, 400 паравозаў, 20 тысяч дзвесце вагонаў і велізарная колькасць усякага роду ваенный маемасці.

Рэвваенсовет Паўднёвага фронта, ачарчыся сазнаннем баявой магутнасці і сілы Чырвоных армій Паўднёвага фронта, шле ўсім доблесным гераям, чырвонаармейцам, камандзірам, камісарам сваё брацкае прывітанне і віншуе з бліскучай перамогай над самым злейшым ворагам рабочых і сялян — арміяй царскіх генералаў і памешчыкаў. Няхай жыве непераможная Чырвоная Армія!

Камандуючы Паўднёвым фронтам
ЕГОРАЎ.

Член РВС Паўднёвага фронта
І. СТАЛІН».

Перамога Чырвонай Арміі над полчышчамі Дзенікіна—перамога геніяльнага Сталінскага стратэгічнага плана.

С. Б.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

УСЯ ПЛОШЧА ІЛЬНУ ЗАМАЦАВАНА ЗА ЗВЕННЯМІ

Практыка мінулага года замацавання за звеннямі ўсёй пасеўнай плошчы ільну ў калгасах зоны дзейнасці нашай МТС дала добрыя вынікі. Сярэдняя ўраджайнасць ільнасемя супроць 1936 года павялічылася з 2,4 да 4,2 цэнтн. з гектара. Лік стаханаўскіх звенняў, якія сабралі па 1 тоне насення з гектара, за мінулы год павялічыўся ў 4 разы.

Зараз усе аграномы МТС праводзяць работу па замацаванню звенняў на ўчастках і на гэты год. Для гэтага ў кожным сельсавеце створаны пяцідзённыя курсы звеннявых. Апрача таго, у больш буйных калгасах калгаснікі займаюцца ў гуртках па вывучэнню агратэхнікі ільну. Гурткамі, як і курсамі звеннявых, кіруюць аграномы.

Аграхімлабараторыя пры нашай МТС праводзіць зараз аналізы глебы, пасля чаго, у адпаведнасці з аграхімічнымі паказальнікамі ў складаемых аграпланах, на кожны ўчастак даецца сістэма ўнясення ў глебу ўгнаенняў. Лабараторыя таксама праводзіць рад вопытаў па паглыбленню ворыўнага гарызонта, што ва ўмовах нашых калгасаў з падзолістымі глебамі мае вялікае значэнне для павышэння ўраджайнасці. У гэтым годзе ў 10-ці калгасах будуць праведзены першыя такія вопыты сяўбы па паглыбленаму ворыву.

Ва ўсіх калгасах поўнасцю засыпаны гатунковым, высокаякасным насеннем насенныя фонды ільну. Калгаснікі разгарнулі збор попелу і курынага памёту, але завоз мінеральных угнаенняў пад лён ідзе слаба. На 100 гектарах у гэтым годзе будуць праведзены першыя вопыты па мульчыраванню пасеваў ільну. Для гэтай мэты яшчэ з лета мінулага года загатоўлен добраякасны торф.

Сваёй задачай калгаснікі і аграномы ставяць — зняць сярэдні ўраджай валакна і ільнянога семя з усёй плошчы не менш 5½—6 цэнтнераў з гектара. Соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, якім ахоплены зараз калгасы, брыгады і звенні, — зарука гэтаму.

Пётр Іванавіч ПЕТУХОЎ,
старшы аграном Борквавіцкай МТС.

АЗДАРАВІЦЬ КОНСКАЕ ПАГАЛОЎЕ

У даны момант у БССР праводзіцца вялікая работа па ліквідацыі інфекцыйнай анеміі. Раённыя камісіі працуюць над тым, каб праверыць коней у пражоных пунктах, правесці дакументацыю, падрыхтаваць усё неабходнае да ўбою і вываду хворых на анемію коней (абсталяванне пагрузачных пляцовак, падрыхтоўка матэрыялаў для абсталявання вагонаў, загатоўка фуражу і т. д.). У гэтай справе рад раёнаў прарабілі вялікую работу, а такія, як Плешчаніцкі, Лоеўскі, Бялыніцкі, Асіпавіцкі, Дубровенскі і некаторыя іншыя, поўнасцю закончылі дакументацыю і прадставілі яе ў Наркамзем. Ямала раёнаў ужо гатовы да адпраўкі коней.

Аднак, важнейшая работа па ліквідацыі анеміі праходзіць яшчэ недастаткова. Ліквідаваць анемію — значыць выявіць усіх хворых і перахварэўшых коней не толькі ў гаспадарках, дзе анемія ўстаноўлена, але і ў гаспадарках, асабліва сумежных, дзе да гэтага часу хвароба не была выяўлена. Ліквідаваць анемію — значыць знішчыць усякія магчымасці далейшых успышак і праяўленняў хваробы.

Неабходна падрыхтаваць да ўбою і вываду хворых і перахварэўшых коней у выяўленых гаспадарках, захаваць правілы цвёрдага каранціравання, правесці старанныя дэзінфекцыі памяшканняў і збруі, каб не асталося ніякіх магчымасцей паўтарэння хваробы ў тых гаспадарках, дзе будзе праведзен убой і вывад коней. Трэба старанна праводзіць тэрмаметраванне коней у сумежных гаспадарках як у калгасах, так і ў аднаасобнікаў.

Але не ўсюды з усёй сур'ёзнасцю вразумелі гэтыя задачы. Вось прыклады. У калгасе «Чырвоны сцяг», Парыцкага раёна, з умоўна здаровай канюшні апошняе выдзяленне хворых было ў снежні 1937 г., а да гэтага часу гной не ачышчан і дэзінфекцыя не праведзена. Прафілактык тут знаходзіцца ў цялятніку. Цяляты з памяшкання прафілактыя ходзяць па ўсяму двару калгаса. На конях, якія знаходзяцца ў ізалятары, ездзяць за вадой, ганяюць на агульны водапой. Абслугоўвае калгас ветфельчар Дамашэўскі.

У калгасе «Сталінец», Глускага раёна (старшыня калгаса Грабко), у ізалятары разам з хворымі і перахварэўшымі коньмі знаходзіцца пара валоў, на якіх возяць барду з спіртаводачнага завода на адлегласці 1½—2 кілометраў. Значыць на валах, якія знаходзяцца ў ізалятары, раз'язджаюць па тэрыторыі не толькі калгаса, але і сельсавета, тады як валы з'яўляюцца механічнымі разносчыкамі заразы — анеміі.

Гэтыя факты паказваюць, што ў радзе месц работа па ліквідацыі інфекцыйнай анеміі праходзіць з рук вон дрэнна, што з боку многіх кіраўнікоў раёна, калгасаў і ветработнікаў праяўлены фармальныя адносіны да гэтай важнейшай справы.

Старшыні райвыканкомаў, сельсоветаў і калгасаў, ветурачы і ветфельчары, усе калгаснікі павінны зразумець, што вывад і ўбой хворых коней — гэта толькі частка работы. Важнейшая работа заключаецца ў тым, каб знішчыць усякую магчымасць распаўсюджвання заразы, каб не было ні аднаго выпадку паўтарэння захворвання анеміяй пасля праведзеных мерапрыемстваў. Толькі пры гэтай умове работа будзе лічыцца праведзенай паспяхова і будуць ліквідаваны вынікі шкодніцтва.

В. МІРОНАЎ,
намеснік наркома Земляробства БССР.

УЗОР СТАХАНАЎСКАЙ РАБОТЫ

ХОЙНІКІ. Калгаснік Федарэнка з калгаса «Чырвоны Кастрычнік», Тульгавіцкага сельсавета, працуе па збору попелу і курынага памёту.

У першы дзень сваёй работы т. Федарэнка сабраў 4 цэнтнеры попелу і зарабіў 8 працадзён. У другі дзень за сабраны попел зарабіў 7 працадзён. Тав. Федарэнка ў барацьбе за высокі ўраджай паказвае стаханаўскія ўзоры работы ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Л. МАКАРАЎ.

Выхад лесарубаў на работу. **На здымку** (злева направа): лесаруб-стаханавец тав. **Пыж**, тэхнарук участка тав. **Пружынін** і лесаруб-стаханавец тав. **Чайка** (Мірадзінскі лясны ўчастак, Бабруйскага лясного пункта).

Фото С. Грына.

БОЛЬШ УВАГІ НАВУЧАННЮ ДАРОСЛЫХ

Ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых — справа вялікай палітычнай важнасці. Але гэта работа ў апошні час пушчана на самацёк, гэтым важнейшым участкам мала хто цікавіцца. Ворагі народа, якія прабраліся ў органы народнай асветы, знарок зрывалі мерапрыемствы партыі і ўрада па навучанню дарослых. Вынікі варожай дзейнасці ў гэтай галіне і на сёнешні дзень яшчэ далёка не ліквідаваны.

1936/37 навучальны год закончан з нездавальняючымі вынікамі па навучанню дарослых. Такі, напрыклад, раён, як Аршанскі, які мае ўсе магчымасці, каб поўнасцю закончыць ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці, за год навучыў усяго 51 чал. непісьменных і 400 чалавек малапісьменных. Загадчык райана тав. Шэйніна зусім не займалася гэтым пытаннем. У Будакашалеўскім раёне скончылі школу дарослых 37 чал. непісьменных і 200 чалавек малапісьменных. Па гораду Слуцку навучана 68 непісьменных і 63 малапісьменных.

Гэтыя нізкія лічбы сведчаць аб тым, што многія кіруючыя раённыя арганізацыі недаацанілі пытанне канчатковай ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

У Клічаўскім раёне за ўвесь навучальны год ні райком партыі, ні райком комсамола, ні райвыканком ні аднаго разу не абмяркоўвалі на сваіх пасяджэннях пытанне аб рабоце школ дарослых. Адгэтуль і такі вынік, што ў раёне вучацца не больш 40 проц. непісьменных і малапісьменных. Ва ўсіх сельсоветах раёна створаны секцыі па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, але гэтыя секцыі не працуюць. У многіх школах дарослых нават няма настаўнікаў. Школы не забяспечаны падручнікамі, сшыткамі.

Часта райкомы партыі і райвыканкомы тлумачаць адсутнасць увагі да ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці загружанасцю іншымі «больш важнымі» пытаннямі. Пухавіцкі райком партыі, напрыклад, тлумачыў дрэнную работу школ дарослых тым, што, моў, усе былі заняты падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР. Між тым, іменна ў часе выбарчай кампаніі школы дарослых павінны былі яшчэ больш узмацніць сваю работу, выбары павінны былі быць сустрэты поўнай ліквідацыяй непісьменнасці і малапісьменнасці.

У нас ёсць нямала і станоўчых прыкладаў работы па навучанню дарослых. У гарадах Гомелі і Віцебску, у Заслаўскім, Рэчыцкім раёнах школамі дарослых ахоплены ўсе непісьменныя і малапісьменныя. Амаль 100 проц. непісьменных і малапісьменных вучацца і ў Рагачоўскім раёне. Але гэтыя прыклады нязначны ў параўнанні з агульным становішчам справы.

У той час, як у большасці раёнаў ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці была пастаўлена вельмі дрэнна, раёны не скарысталі адпушчаных на гэту справу сродкаў. Тысячы рублёў асталіся нескарыстанымі, а Слуцкі райвыканком, напрыклад, не гледзячы на гэта, тры месяцы затрымлівае зарплату настаўнікаў.

Неабходна рашуча палепшыць справу ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, да канца выкарчаваць вынікі шкодніцтва на гэтым участку. Наркамасветы БССР павінен неадкладна наладзіць аператыўнае, жывое кіраўніцтва раёнамі, забяспечыць школы дарослых настаўнікамі, стварыць усе ўмовы для паспяховага навучання.

Партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя арганізацыі павінны мабілізаваць свой актыў, каб узняць на належную вышыню работу школ дарослых, ахапіць навучаннем усіх непісьменных і малапісьменных і ў гэтым годзе поўнасцю ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць — гэту праклятую спадчыну царызма.

Н. ЖЫНКО.

ПАХАВАННЕ АДВАЖНЫХ ПАВЕТРАПЛАВАЦЕЛЯЎ

Урны з прахам бясстрашных паветраплавацеляў тт. Гудаванцэва, Панькова, Дземіна, Лянгузова, Кулагіна, Рытслянда, Мячкова, Каняшына, Шмелькова, Нікіціна, Кандрашэва, Чэрнова, Градуса, загінуўшых пры катастрофе дырыжабля «СССР В-6», у ноч на 12 лютага былі ўстаноўлены ў Калоннай зале Дома саюзаў. Ля падножжа высокага пастамента, акружанага зялёнымі пальмамі і жывымі кветкамі, вянкі: ад МК ВКП(б), Галоўнага ўпраўлення грамадзянскага паветранага флота, ад Галоўпаўночморшляха, ад рабочых маскоўскіх фабрык і заводаў, родных і блізкіх. Шмат вянкоў з партрэтамі загінуўшых, чые імёны назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю совецкага паветраплавання.

У 9 гадзін раніцы адкрыўся доступ у Калонную залу Дома саюзаў. Развітацца з прахам загінуўшых прышлі шматлікія дэлегацыі рабочых маскоўскіх прадпрыемстваў, стаханаўцы, вучоныя, лётчыкі, камандзіры, інжынеры, чырвонаармейцы, студэнты.

У зале цішыня. Гучаць жалобныя маршы. Вакол пастамента — родныя і блізкія.

Бясшумна змянялася ганаровая варта. У зменах стаялі сакратар МГК ВКП(б) тав. Братаноўскі, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Косарэў, начальнік Галоўнага ўпраўлення грамадзянскага паветранага флота тав. Молакаў, выконваючы абавязкі начальніка Галоўпаўночморшляха т. Ушакоў, начальнік палярнай авіяцыі Галоўпаўночморшляха т. Цатураў, начальнік ваенна-паветраных сіл РСЧА камкор тав. Лакціонаў, герої Совецкага Саюза тт. Смушкевіч, Спірын, Аляксееў, Сляпнёў, вядомы стратанаўт тав. Бірнбаум, удзельнікі апошняга палёту на дырыжаблі «СССР В-6» тт. Бурмакін, Пачэкін, Варабʼёў, Усціновіч, лётчыкі, бортмеханікі, радысты і штурманы.

За пяць гадзін праз Калонную залу прайшлі дзесяткі тысяч працоўных сталіцы. У 14 гадзін доступ у залу быў спынен.

Апошнія хвіліны развітання. У ганаровую варту сталі родныя, блізкія і прыяцелі нябожчыкаў.

У 15 гадзін урны вынеслі з Калоннай залы. Жалобны карцеж павольна рушыўся ў напрамку да Нова-Дзявічых могілак міма выстраіўшыхся ўздоўж тратуараў калон працоўных.

У 16 гадзін 30 мінут звыш 50 тысяч працоўных Масквы ў жалобнай працэсіі падышлі да Нова-Дзявічых могілак. Адкрываецца жалобны мітынг. Ад імя работнікаў грамадзянскай авіяцыі выступае начальнік Галоўнага ўпраўлення грамадзянскага паветранага флота Герой Совецкага Саюза тав. В. С. Молакаў.

— Сёння мы хаваем трынаццаць верных сыноў соцыялістычнай радзімы, — гаворыць ён. — Краіна ніколі не забудзе імён адважных паветраплавацеляў.

Яшчэ нядаўна мы бачылі іх жыццерадаснымі, поўнымі сіл і энергіі, поўнымі творчых імкненняў. Даведаўшыся аб становішчы гераічных зімоўшчыкаў станцыі «Паўночны полюс», яны прапанавалі ўраду зняць папанінцаў на дырыжаблі. Было рашано правесці выпрабавальны пералёт па маршруту Масква—Мурманск—Масква з тым, каб пасля гэтага абмеркаваць канчаткова пытанне аб пасылцы дырыжабля да лагера Папаніна.

З выключным энтузіязмам рыхтаваліся яны да гэтага адказнага рэйса. Недарэчны выпадак прывёў да катастрофы дырыжабля. Уся краіна глыбока перажывае пагібель 13 смелых авіятараў.

Мы добра ведалі кожнага з іх. З іх імёнамі звязана ўся гісторыя совецкага дырыжаблебудаўніцтва. Камандзір карабля тав. **Гудаванцэў** быў адным з бліскучых прадстаўнікоў сучаснага паветраплавання. Пад яго кіраўніцтвам совецкія паветраныя караблі зрабілі рад бліскучых палётаў. Ён нястомна распрацоўваў тэхніку ваджэння дырыжабляў, паказваючы ўзоры ведання справы, асабістай мужнасці і адвагі. Імёны таварышаў **Панькова, Дземіна, Лянгузова, Кулагіна** і іншых таксама назаўсёды запісаны на старонках гісторыі совецкай авіяцыі.

У асобе таварыша Рытслянда мы страцілі аднаго з лепшых штурманаў Совецкага Саюза, выдатнага аэранавігатара і вельмі добрага таварыша. Мне асабіста вельмі цяжка гэта ўтрата, бо таварыш Рытслянд на працягу многіх год быў маім нязменным спадарожнікам ва ўсіх палётах. Гэта быў чалавек велізарных ведаў і вопыту, вялікай скромнасці і бездакорнай чэснасці.

Усе гэтыя выдатныя якасці, характарызуючыя новага чалавека сталінскай эпохі, поўнасцю адносяцца і да іншых таварышаў, загінуўшых смерцю храбрых на баявым пасту. Усё іх жыццё было напоўнена ўпартай працай, вучобай. Яны паказвалі прыклад беззаветнага служэння той справе, якая ім была даверана, прыклад бязмежнай адданасці соцыялістычнай радзіме.

Мы схіляем галовы перад памяццю загінуўшых таварышаў і абяцаем над іх магілай прыкласці ўсе сілы для прадаўжэння і развіцця той справы, за якую яны змагаліся, за якую аддалі сваё маладое жыццё. Мы абяцаем над іх магілай таксама чэсна і аддана служыць сваёй радзіме і сваёй партыі, як служылі яны, і калі спатрэбіцца, аддаць сваё жыццё на карысць совецкай краіны.

Вечная памяць загінуўшым паветраплавацелям!

З успамінамі аб заўчасна загінуўшых паветраплавацелях выступілі таксама тав. Белкін (прадстаўнік эскадры дырыжабляў) і Герой Совецкага Саюза тав. Аляксееў (прадстаўнік Галоўнага Упраўлення Паўночнага Марскога Шляха).

У 17 гадзін жалобны мітынг закрываецца. Урны з прахам загінуўшых паветраплавацеляў паднімаюць іх прыяцелі, не адзін раз разам з імі бараздзіўшыя паветраныя прасторы краіны соцыялізма. Жалобны марш змяняецца гукамі «Інтэрнацыянала». Урны ўстанаўляюцца ў нішах сцяны Нова-Дзявічых могілак.

(БЕЛТА).

СПАЧУВАННІ ДЫПЛАМАТЫЧНАГА КОРПУСА

У сувязі з пагібеллю дырыжабля «СССР В-6» на імя народнага камісара замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінава паступілі спачуванні іспанскага пасла п. Марселіно Паскуа ад імя ўрада Іспанскай рэспублікі, іранскага пасла п. Сепахбодзі, балгарскага пасланіка п. Антонава ад імя ўрада Балгарыі, паверанага ў справах Кітайскай рэспублікі п. Ю-Міна, паверанага ў справах Бельгіі п. Хэйндрыкса ад імя бельгійскага ўрада.

***

Эстонскі пасланнік п. Рэй наведаў намесніка народнага камісара замежных спраў тав. В. П. Пацёмкіна і выказаў яму сваё спачуванне ў сувязі з катастрофай дырыжабля «СССР В-6».

(БЕЛТА).

ВЯЛІКІЯ ПЕРАМОГІ КАЛГАСНАГА ЛАДУ

—о— Е. ЗАЛЕСКІ —о—

На студзеньскім Пленуме ЦК ВКП(б) у 1933 годзе таварыш Сталін гаварыў: «Калгасы замацаваны, і шлях да старой, аднаасобнай гаспадаркі закрыт канчаткова. Цяпер задача састаіць у тым, каб умацаваць калгасы **арганізацыйна**, вышыбіць адтуль шкодніцкія элементы, падабраць сапраўдныя, праверяныя большэвіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды большэвіцкімі».

За годы першай сталінскай пяцігодкі калгасны лад перамог канчаткова і беспаваротна. Замест акіяна дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак па ўсяму Совецкаму Саюзу выраслі буйныя калгасы, узброеныя новай тэхнікай. Кулацтва як клас было ў асноўным ліквідавана на базе суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Быўшыя сяляне-беднякі, увайшоўшы ў калгасы, за кароткі час значна палепшылі свой матэрыяльны дабрабыт, узняўшы свой узровень жыцця да ўзроўню сераднякоў.

На першым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў 19 лютага 1933 года таварыш Сталін паказаў далейшы шлях пераможнага ўмацавання калгаснага ладу. Ен гаварыў: «Каб рушыць далей і канчаткова ўмацаваць калгасы, мы павінны зрабіць **другі** крок, мы павінны дабіцца **новага** дасягнення. У чым састаіць гэты другі крок? Ен састаіць у тым, каб падняць калгаснікаў,—і быўшых беднякоў, і быўшых сераднякоў,—яшчэ вышэй. Ен састаіць у тым, каб **зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі**».

Гэтыя мудрыя ўказанні любімага правадыра народа таварыша Сталіна асвятлілі далейшы шлях калгаснага будаўніцтва. Просты і ясны для ўсіх лозунг партыі — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі — мабілізаваў мільёны сялян на чэсную працу ў калгасах, на збяражэнне калгаснай, соцыялістычнай маемасці.

За мінуўшыя пяць гадоў з дня першага Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў калгасы СССР дасягнулі вялізарных перамог. Калі ў канцы 1932 года было калектывізавана 61,5 процента ўсіх сялянскіх гаспадарак, то на 1 студзеня 1938 года ў калгасах аб'яднана 93 проц. усіх сялянскіх двароў Саюза ССР.

Соцыялістычная прамысловасць узброіла 243.700 калгасаў навейшымі сельскагаспадарчымі машынамі. На 1 студзеня 1933 года ў СССР было 2115 машынна-трактарных станцый, а на 1 студзеня 1938 года — 5819, якія абслугоўваюць амаль усе калгасы. У МТС налічваецца 367.000 трактараў, 62,3 тыс. аўтамашын, 104,6 тыс. камбайнаў і многа іншых складаных машын.

Большэвіцкай партыяй выхаваны многатысячныя кадры кіраўнікоў калгаснай вытворчасці і кваліфікаваных вадзіцеляў складаных сельскагаспадарчых машын.

У выніку вялікіх перамог у справе ўмацавання калгаснага ладу ў 1937 годзе атрыман прырост сельскагаспадарчай прадукцыі амаль у паўтара раза больш, чым ва ўраджайным 1935 годзе. Па Совецкаму Саюзу сабрана каля 7 мільярдаў пудоў зярна. Такіх тэмпаў прыросту сельгаспрадукцыі ніколі не мела і не можа мець ні адна капіталістычная краіна.

Пад кіраўніцтвам і пры дапамозе большэвіцкай партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, калгасы Совецкай Беларусі, як і ўсе калгасы СССР, за 5 год пасля першага Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў атрымалі бліскучыя перамогі. У канцы першай пяцігодкі ў калгасах БССР аб'ядналася 47,8 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На 1 кастрычніка 1937 года ў калгасах рэспублікі аб'яднана 87,7 проц. усіх сялянскіх двароў.

У канцы 1932 года ў БССР было 60 МТС з трактарным паркам — 1500 штук, пры гэтым значную частку трактараў складалі маласільныя «Фардзоны-Путілаўцы». На 1 студзеня 1938 года ў БССР ёсць 200 МТС, якія абслугоўваюць амаль усе калгасы. У МТС налічваецца 7480 трактараў, з якіх 570 штук магутныя «Сталінцы» чэлябінскага трактарнага завода. Апрача гэтага, у МТС ёсць 910 аўтамашын, 610 камбайнаў, у тым ліку 296 паўднёвых «Комунараў», а астатнія — паўночныя камбайны; шыроказахватных ільнацерабілак МТС зараз маюць 1149.

За апошнія годы значна вырас парк аўтамашын саміх калгасаў. К канцу 1937 года ў калгасах Совецкай Беларусі ўжо налічвалася 1429 грузавых аўтамашын.

Адначасова з ростам механізацыі і аўтамабілізацыі калгаснай гаспадаркі паступова ўзрастае яе электрыфікацыя. Калі на канец першай пяцігодкі ў БССР было 25 электрыфікаваных калгасаў, то к канцу 1937 года мы ўжо маем 205. Калгасы выкарыстоўваюць электрычнасць не толькі для асвятлення, але і для патрэб вытворчасці. Напрыклад, электрамалацільных пунктаў у калгасах у 1932 годзе было 45, а ў 1937 годзе — 215.

Узросшая механізацыя соцыялістычнай сельскай гаспадаркі Совецкай Беларусі і вырасшая творчая актыўнасць калгасных масс забяспечылі ўмовы для ўкаранення ў вытворчасць перадавой агратэхнікі. Значна скараціліся страты пры ўборцы і апрацоўцы ўраджаю. За 5 гадоў, мінуўшых з часу першага Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў, значна вырасла валавая прадукцыя паляводства калгасаў БССР. Напрыклад, па ільнавалакну ў 1932 годзе атрымана валавой прадукцыі 570.000 цэнтнераў, а ў 1937 годзе, не гледзячы на скарачэнне пасеўнай плошчы ільну згодна плана, валавая прадукцыя ільнавалакна па папярэдніх няпоўных даных складае 640.000 цэнтнераў.

Па бульбе валавая прадукцыя павялічылася ад 50.600 тысяч цэнтнераў у 1932 годзе да 70.056 тысяч цэнтнераў у 1937 годзе (па папярэдніх даных).

Вялікія змены ёсць у галіне жывёлагадоўлі. На 1 ліпеня 1933 года ў калгасах БССР было абагуленай буйнай рагатай жывёлы 452.058 галоў, а на 1 студзеня 1938 года ў калгасах рэспублікі ўжо ёсць абагуленай буйнай рагатай жывёлы 722.028 галоў. Свіней у абагуленым карыстанні на 1 ліпеня 1933 года было ў калгасах 163.247 галоў, а на 1 студзеня 1938 года — 208.885 галоў.

Прыведзеныя лічбы красамоўна гавораць аб вялікіх поспехах развіцця калгаснай вытворчасці нашай рэспублікі. Бліскучыя перамогі калгасаў па ўсіх галінах гаспадаркі найбольш ярка відны з лічбаў росту валавога даходу калгасаў. Прывядзем прыклады.

Калгас «XIII Кастрычнік», Тураўскага раёна, які з'яўляецца кандыдатам у экспаненты Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, у 1935 годзе меў агульнага даходу 68.892 рублі, у 1936 годзе — 108.438 рублёў, у 1937 годзе — 153.802 руб., з якіх 104.173 рублі грашовага даходу. Вялікія лішкі збожжа, бульбы, гародніны і іншай прадукцыі калгас прадае дзяржаўным арганізацыям і на калгасным рынку. На кожны працадзень у 1937 годзе тут выдана па 3,109 кгр. зярна, 10 кгр. бульбы, 1,5 кгр. гародніны, 3,7 кгр. фуражу і 1 руб. грашыма.

Кандыдат у экспаненты Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі па зернавых культурах калгас імя Тэльмана, Брагінскага раёна, у 1935 годзе меў агульнага даходу 121.910 руб., у 1936 годзе — 140.023 руб., і ў 1937 годзе — 193.005 руб. Гэтыя лічбы асабліва цікавы тым, што яны паказваюць сістэматычны рост калгаснага багацця з года ў год.

У гэтым калгасе за апошнія два годы падвоілася аплата працадня калгаснікаў. У 1935 годзе на кожны працадзень было выдана 1,03 руб. грашыма, 1,8 кгр. зярна, 8 кгр. бульбы. У 1937 годзе на кожны працадзень выдана 2 р. 56 к. грашыма, 3,6 кгр. зернавых, 12,5 кгр. бульбы, 1,35 кгр. гародніны і 1,25 кгр. фруктаў.

Такіх прыкладаў можна прывесці вельмі многа. Мы ўжо не гаворым аб такіх калгасах рэспублікі, якія выдаюць на працадзень па 6—7 кг. зярна, па 12—16 кг. бульбы і 4—5 руб. грашыма. Аб некаторых з гэтых калгасаў ужо пісалася ў рэспубліканскім друку.

Умацаванне калгасаў і рост заможнасці калгаснікаў спрыяла росту культуры калгаснай вёскі. У калгасах БССР цяпер ёсць 3.319 бібліятэк і 1.409 хатчытальнь. Усе дзеці калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў ахоплены школьным навучаннем. На вёсцы ёсць 582 сталых дзіцячых садоў. Летам 1937 года ў калгасах існавала 5.063 дзіцячыя пляцоўкі. Гэтымі пляцоўкамі было ахоплена 143.400 дзяцей дашкольнага ўзросту. У калгасах рэспублікі шырока развілася народная творчасць і самадзейнасць розных мастацкіх гурткоў.

Усе поспехі калгасаў БССР былі-б яшчэ большымі, каб банда трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў і дыверсантаў не нашкодзіла ў сельскай гаспадарцы. Гэта банда шкоднікаў і шпіёнаў дзякуючы пільнасці слаўнай совецкай разведкі выкрыта і ліквідавана. Ворагі совецкага народа будуць знішчаны да канца.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР аказалі велізарную дапамогу калгаснаму сялянству БССР у справе хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Калгаснікам вернуты незаконна адрэзаныя шкоднікамі прысядзібныя землі. Ліквідаваны шкодніцка-арганізаваныя саўгасы і іх земля вернута калгасам.

У другой палове 1937 года ў БССР арганізаваны новыя 60 МТС. Калгасам перададзены 480.000 гектараў лясных угоддзяў з лясоў дзяржаўнага і мясцовага значэння. Цэлы рад іншых ільгот атрымалі калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі.

Адным з самых вялікіх дасягненняў калгаснага ладу з'яўляецца рост выдатных людзей: стаханаўцаў і таленавітых кіраўнікоў калгаснай вытворчасці. Выраслі дзесяткі тысяч стаханаўцаў, энтузіястаў калгаснай працы, аддаючых увесь свой вопыт на ўмацаванне калгасаў і ўкладаючых усю сваю энергію ў справу барацьбы за далейшы росквіт калгасаў.

Шырокім масам Совецкай Беларусі добра вядомы імёны Софіі Пятроўны Рачок, Івана Трафімавіча Значонка і іншых стаханаўцаў сельскай гаспадаркі, якія воляю народа зараз з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР.

Ордэнаносцы з Аршанскага раёна Сяргей Фаміч Палітыка, Праскоўя Канстанцінаўна Ціханская і іншыя стаханаўцы вядомы ўсім калгаснікам дасягненнямі ў барацьбе за высокі ўраджай ільну.

Старшыні калгасаў—«Чырвоны партызан», Менскага раёна, Сяргей Іосіфавіч Бэйне і «Совецкая Беларусь», Тураўскага раёна, Панцялей Іванавіч Тарасюк, дзесяткі і сотні іншых — добрай арганізацыяй працы забяспечылі ў сваіх калгасах сістэматычны рост ураджайнасці.

Даярка калгаса «Чырвоная Бярэзіна», Бабруйскага раёна, Ефрасінья Герасімаўна Чарнецкая атрымала ў мінулым годзе па 4025 літраў малака ад кожнай каровы ў абслугоўваемай ёю групе.

Такіх людзей — партыйных і непартыйных большэвікоў у калгасах Совецкай Беларусі становіцца ўсё больш і больш. Яны — палкія патрыёты сваёй соцыялістычнай радзімы — актыўна змагаюцца за далейшыя поспехі ў справе будаўніцтва соцыялізма.

Дапамога совецкага ўрада і клопаты любімага правадыра народаў таварыша Сталіна натхняюць калгасныя масы на барацьбу за новыя поспехі ў 1938 годзе. Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы першага года трэцяй пяцігодкі, за атрыманне ўраджаю, дастойнага паказу на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Натхнёныя вялікімі перамогамі, якія атрыманы пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і любімага правадыра таварыша Сталіна, калгаснікі Совецкай Беларусі разам з калгаснікамі ўсёй нашай шчаслівай радзімы пойдуць па шляху далейшага магутнага развіцця, далейшых гістарычных перамог.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАУНОЧНЫМ КІТАІ

ЛОНДАН, 12 лютага. (БЕЛТА). Шанхайскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што кітайскія войскі правялі паспяховае контрнаступленне ў паўднёвай частцы правінцыі Хэбэй. Кітайскія войскі ўзялі горад Цынфын і прадаўжаюць наступленне на горад Наньло.

У ПАУДНЕВЫМ КІТАІ

ШАНХАЙ, 12 лютага. (БЕЛТА). Па паведамленню газеты «Дамейваньбао», большасць японскіх ваенных караблёў, якія прымалі ўдзел у нападах на ўзбярэжжа правінцыі Гуандун, адышло да берагоў правінцыі Фуцзянь. Газета адзначае, што японцы пры спробах прарвацца ля фартоў Бокатыгрыс (каля Кантона) сустрэлі выключна моцнае супраціўленне з боку кітайцаў. Форт добра ўмацаван. Японскія атакі не нанеслі яму сур'ёзных пашкоджанняў.

У сучасны момант японцы сканцэнтроўваюць свае марскія сілы ля ўзбярэжжа правінцыі Фуцзянь з тым, каб павесці наступленне на гэту правінцыю.

***

ЛОНДАН, 12 лютага. (БЕЛТА). Ганконгскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 11 лютага японскі ўзброены тральшчык абстраляў чатыры кітайскія джонкі. Японскі тральшчык адкрыў кулямётны агонь па кітайскіх джонках у той час, калі яны знаходзіліся ў англійскіх тэрытарыяльных водах поблізу Ганконга. Паліцэйскія Ганконга, пад'ехаўшыя на кацерах да загарэўшыхся джонак, ліквідавалі пажар і выратавалі каманды.

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ЛОНДАН, 12 лютага. (БЕЛТА). Ханькоўскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 11 лютага японскія самалёты, скарыстаўшы густы туман, зрабілі налёт на Ханькоу. З самалётаў было скінута некалькі бомб і тысячы пракламацый. У выніку густога туману дзеянні кітайскай зенітнай артылерыі былі затруднены. Праляцеўшы над Ханькоу, японскія самалёты перасеклі раку Янцзы і накіраваліся ў бок Учана. Дасягнуўшы Учана, японскія самалёты падверглі бамбардыроўцы грамадзянскі аэрадром.

***

ЛОНДАН, 12 лютага. (БЕЛТА). Шанхайскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў паўднёвым сектары чыгункі Цяньцзінь—Пукоу японскія войскі перайшлі раку Хуайхе.

Карэспандэнт піша, што атрады кітайскіх партызан прадаўжаюць актыўныя дзеянні ў тылу японскіх войск.

ЯПОНЦЫ УЖЫВАЮЦЬ ІПРЫТ

ЛОНДАН, 12 лютага. (БЕЛТА). Карэспандэнт агенцтва «Брыціш Юнайтэд Прэс» паведамляе, што японцы ў баях на фронце Лунхайскай чыгункі ўжываюць атручваючыя матэрыі. У прыватнасці карэспандэнт указвае на ўжыванне японцамі іпрыта.

ПАДЗЕІ Ў ГЕРМАНІІ

МАСАВЫЯ РАССТРЭЛЫ У АРМІІ

ВАРШАВА, 11 лютага. (БЕЛТА). Польскія газеты прыводзяць новыя факты аб хваляваннях і мяцежах у германскай арміі, аб масавых расстрэлах, аб уцяканні заграніцу афіцэраў рэйхсвера (арміі). «Ілюстраваны кур'ер подзенны» канстатуе, што ўнутраны крызіс у Германіі зусім нельга лічыць ліквідаваным. Па словах газеты, весткі аб бунтах у германскіх гарнізонах Памор'я пацвярджаюцца поўнасцю. Газета друкуе таксама паведамленні аб расстрэлах і расправах Гестапо з германскімі афіцэрамі і аб масавых арыштах, якія праводзяцца сярод германскіх прамысловых колаў, западазроных ва ўдзеле ў змове супроць Гітлера.

БАРАЦЬБА МІЖ ФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫЯЙ І ВАЕННЫМІ КОЛАМІ

ПРАГА, 12 лютага. (БЕЛТА). Як указвае кансерватыўная газета «Народні палітыка», афіцыяльнае абвяржэнне аб тым, што ніякай змовы ў германскай арміі не было і што чуткі такога роду «з'яўляюцца хлуслівымі», не адпавядае сапраўднасці. Газета канстатуе наяўнасць абвостранай барацьбы паміж фашысцкай партыяй і ваеннымі коламі. Апазіцыйна настроенае афіцэрства аказала супраціўленне масавым арыштам. «Так, напрыклад, — піша газета, — у Аленштэйне (Усходняя Прусія), дзе знаходзіцца 11-я дывізія, справа дайшла да адкрытых пратэстаў і спроб паўстання». Тое-ж самае наглядалася і ў радзе гарнізонаў Прыморскай вобласці.

«Там, дзе апазіцыя вылілася ў прамое паўстанне, — піша газета, — праведзены масавыя арышты; вінаватыя прадстануць перад ваенным судом». Па думцы газеты, колькасць арыштаваных афіцэраў, у тым ліку і генералаў, вельмі вялікая, яшчэ больш вялікі лік афіцэраў, ушоўшых з арміі ў знак пратэста супроць гітлераўскіх мерапрыемстваў.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ У КЕНІГСБЕРГУ І МЮНХЕНЕ

ПРАГА, 12 лютага. (БЕЛТА). Рабочая газета «Гало новіны» паведамляе, што ў Кенігсбергу (Усходняя Прусія) і ў Мюнхене адбыліся крывавыя сутычкі, падрабязнасці якіх яшчэ невядомы. У гарадах, дзе адбыліся непарадкі, звязаныя з выступленнямі мясцовых гарнізонаў, паштова-тэлеграфныя памяшканні заняты агентамі Гестапо і ўстаноўлена найстражэйшая цэнзура на адпраўляемыя тэлеграмы, тэлефонныя размовы і т. п.

У адным з гарадоў Баварыі, па паведамленню «Гало новіны», адбылося ўзброенае паўстанне часцей гарнізона, якое было ліквідавана пры ўдзеле артылерыі і ваеннай авіяцыі.

Адначасова газета паведамляе, што толькі да 4 лютага Гестапо было арыштавана ў Баварыі да 300 афіцэраў-актывістаў. З Баварыі ўцякло многа афіцэраў; яны бягуць у Аўстрыю, Швейцарыю і Чэхаславакію.

***

ЛОНДАН, 11 лютага. (БЕЛТА). Берлінскі карэспандэнт газеты «Таймс» піша, што ў ваенных колах Германіі рашуча выступалі не толькі супроць падпарадкавання арміі фашысцкай партыі, але і супроць назначэння Рыбентропа міністрам замежных спраў. Мабыць, — гаворыць карэспандэнт, — шмат афіцэраў дорага паплаціліся за свае выступленні.

Як паведамляе берлінскі карэспандэнт газеты «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», у фашысцкіх колах наглядаецца яўная баязнь далейшага пашырэння незадаволення, існуючага ў арміі. У сувязі з гэтым, — гаворыць карэспандэнт, — створаны змешаныя камісіі, якія павінны правесці «чыстку» як у рэйхсверы, так і па ўсёй краіне. Камісіі складзены з фашысцкіх афіцэраў рэйхсвера і роўнай колькасці спецыяльна выбраных членаў ахоўных атрадаў.

Маладыя байцы за вывучэннем матора танка. (Н-ская часць, якой камандуе маёр тав. Шабараў).

Фото Л. Мазелева. (БСФ).

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТ

ДЗЕНЬ У ДОМЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Дом Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава — любімае месца забаў і культурнага адпачынку байцоў і камандзіраў часцей Менскага гарнізона. Асабліва вялікае ажыўленне тут у сувязі з набліжэннем XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Па вечарах у Доме Чырвонай Арміі чытаюцца лекцыі на рознастайныя тэмы, дэманструюцца кінофільмы, наладжваюцца канцэрты з выступленнямі лепшых артыстаў Саюза і БССР. У першакласна абсталяваных кабінетах, лабараторыях, аўдыторыях штодзённа праходзяць заняткі курсаў, гурткоў. Калектывы мастацкай самадзейнасці — ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі, джаз-аркестр, хор — рыхтуюць да юбілею свае творчыя справаздачы. З вялікім поспехам праходзяць вечары сустрэч актыўных удзельнікаў грамадзянскай вайны з маладымі байцамі. Рэзка павялічыўся лік экскурсій рабочых, калгаснікаў, вучняў, якія часта прыязджаюць з самых далёкіх раёнаў рэспублікі, каб азнаёміцца з гэтым выдатным чырвонаармейскім палацам культуры.

Багатым і рознастайным па зместу быў дзень 12 лютага. У гэты дзень Дом Чырвонай Арміі наведала больш 3.000 чалавек — чырвонаармейцаў, камандзіраў і іх жонак, рабочых, школьнікаў.

Раніцай перад комсамольскім актывам гарнізона выступаў з дакладам на тэму «Абарона Царыцына» маёр Ільніцкі. Дацэнт Ленінградскага універсітэта Шэўчэнка прачытаў даклад аб Шота Руставелі. Армейскія комсамольцы з вялікай цікавасцю глядзелі выстаўку «XX год Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота», арганізаваную ў фае канцэртнага зала. 250 карцін, фатаграфій, дакументаў, сабраных на гэтую выстаўку, даюць яркае ўяўленне аб гераічным шляху непераможнай Чырвонай Арміі. Комсамольцам быў таксама паказан фільм «Бялее парус адзінокі».

Вечарам для камандзіраў і членаў іх сямей быў наладжан культшэфскі канцэрт з удзелам калектываў Беларускай дзяржаўнай філармоніі — сімфанічнага аркестра, ансамбля беларускай песні і пляскі і інш.

У гэты дзень Дом Чырвонай Арміі наведалі 23 экскурсіі рабочых, служачых, вучняў. Сярод экскурсантаў былі чыгуначнікі, работнікі Акадэміі навук БССР, тэлеграфісты, члены прамысловай арцелі «Новы шлях», рабочыя-харчавікі, выхаванцы дзіцячага дома.

ВЫСТАЎКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ імя ЛЕНІНА

Учора ў Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрылася выстаўка, прысвечаная слаўнаму 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Фото, дакументы і літаратура, рэпрадукцыі з карцін проста і зразумела паказваюць гераічны шлях РСЧА ад чырвонагвардзейскіх атрадаў да самай перадавой і магутнай арміі ў свеце.

Выстаўка пачынаецца з раздзела «Класікі марксізма-ленінізма аб узброеным паўстанні пролетарыята». На драпіраваным чырвонай матэрыяй шчыце — барэльеф Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Даны іх геніяльныя выказванні аб узброеным паўстанні і артыкул 133 вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Тут-жа побач адлюстравана, як вялікія правадыры пролетарыята, геніяльныя стратэгі рэвалюцыі Ленін і Сталін упершыню ў гісторыі чалавецтва арганізоўваюць і згуртоўваюць армію працоўных. Рэпрадукцыі з карцін паказваюць Леніна і Сталіна ў годы грамадзянскай вайны.

Другі раздзел уваскрашае ў памяці гераічную барацьбу працоўных пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна за сваё вызваленне ад іга капіталізма. Прыцягваюць увагу рэпрадукцыі з карцін «Паўстанне на броненосцу «Пацёмкін Таўрычаскі» ў 1905 годзе» — мастака Шэстапалава і «Ўзяцце Чырвонай гвардыяй Зімовага палаца» — мастака Шчэглова.

Добра падабраныя фото і дакументы малююць ролю партыі Леніна—Сталіна ў стварэнні Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. З вялікім інтарэсам праглядваюцца раздзелы, прысвечаныя барацьбе Чырвонай Арміі з ворагамі савецкай краіны на франтах грамадзянскай вайны. Карціны, фото і дакументы адлюстроўваюць дні пераможных паходаў слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Тут мы бачым вядомую карціну мастака Грэкава «Сталін і Варашылаў у акопах пад Царыцынам». Невялікі аддзельчык малюе гераічную барацьбу Чырвонай Арміі з белапольскімі інтэрвентамі.

У вітрынах выстаўлена літаратура па гісторыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, а таксама лепшыя творы мастацкай літаратуры на абаронныя тэмы, як «Чапаеў», «Народжаныя бурай» і інш.

На адным з шчытаў выдзяляецца постаць чырвонаармейца з вінтоўкай у руках, увасабляючага непераможную сілу нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

А. С. Даргамыжскі

(Да 125-годдзя з дня нараджэння)

14 лютага 1938 года спаўняецца 125 год з дня нараджэння Александра Сергеевіча Даргамыжскага, аднаго з найвялікшых рускіх кампазітараў, гордасці і ўпрыгожання рускага музыкальнага мастацтва.

Сярод ранніх твораў Даргамыжскага — музыкальна-вакальных дробязей па французскія і рускія тэксты — мы знаходзім і такія, у якіх ужо выяўляецца каласальны талент і напрамак будучага вялікага кампазітара.

Першы твор Даргамыжскага для опернай сцэны — «Эсмеральда» (на тэмы «Сабора Парыжскай богамацеры» Гюго) і опера-балет «Урачыстасць Вакха» — на тэкст Пушкіна — не мелі поспеху. Пры ўсіх недахопах «Урачыстасці Вакха», у гэтым творы ёсць ужо рыса будучага Даргамыжскага, — яна выяўляецца хаця-б у імкненні наблізіцца да пушкінскай паэзіі, даць яе музыкальнае праламленне. З гэтага моманту Даргамыжскі становіцца следам за Глінкай абвяшчальнікам паэтычных прынцыпаў у рускай музыцы.

Мы яшчэ і да гэтай пары недастаткова ясна ўяўляем сабе значэнне творчасці Пушкіна ў рускім музыкальным мастацтве. Можна без усякага перабольшання сказаць, што з часу Глінкі гісторыя рускай музыкі ў многім звязана з паэзіяй Пушкіна. Ацэньваючы творчасць А. С. Даргамыжскага, мы абавязаны перш за ўсё лічыцца іменна з пушкінскім струменем у яго творах.

Яшчэ ў 1843 годзе Даргамыжскі задумвае пісаць оперу па драме Пушкіна «Русалка». Ён сам распрацоўвае лібрэто, намячае дзесяткі варыянтаў. «Русалка», па праву, лічыцца найвыдатным творам Даргамыжскага. У гэтай оперы Даргамыжскі выступае ўжо як вялікі рэаліст, няўтомны шукальнік і абаронец праўдзівага мастацтва.

У сціслай форме тут падана цэлая праграма музыкальнага рэалізма, не ўтраціўшая свайго значэння аж да нашых дзён.

У «Русалцы» гэта праграма яшчэ не атрымала свайго поўнага ажыццяўлення. У «Русалцы» многа яшчэ ад тыповых прыёмаў і традыцый французскай і італьянскай опер, ёсць яшчэ сёе-тое няспелае і шаблоннае. Але ўсё гэта бляднее, робіцца непрыкметным у параўнанні з геніяльнымі дасягненнямі оперы.

У «Русалцы» Даргамыжскі дасягае сапраўднага драматызма нават там, дзе, здавалася-б, фантастычнасць сцэнічнага дзеяння амаль выключае гэта. Калі ў разгар вясельнага піру, сярод весялосці і гульняў, раптам, нібы стогн, раздаецца песня пакінутай Наташы — русалкі, самы спакойны і разважны слухач адчувае халадок жаху, які прабягае па целу. Тут няма і следу той опернай чартаўні, якою так багата фантастычная опера першай паловы XIX стагоддзя. Самая фантастыка ў «Русалцы» набывае народна-казачны характар, уласцівы пушкінскаму твору.

У «Русалцы» Даргамыжскі выступае і як геніяльны рэаліст. Музыкальныя характарыстыкі ў гэтай оперы набываюць ужо адчувальную чоткасць і яснасць, у іх увасабляецца літаратурны і сцэнічны вобраз героя спектакля.

Опера «Каменны госць» — твор у сваім родзе адзіны і займае асаблівае месца ў сусветнай опернай літаратуры. У «Каменным госцю» нібы ўвасобіліся мастацкія ідэалы кампазітара, знайшлі сваё завяршэнне творчыя шуканні ўсяго яго жыцця.

Опера гэта не мае спецыяльнага лібрэто і ўяўляе сабой як-бы музыкальны аднайменны «пераклад» пушкінскай трагедыі. «Каменны госць» Даргамыжскага смела парывае з традыцыйнымі оперпымі формамі. Пушкінскі дыялог поўнасцю захоўваецца ў оперы. Даргамыжскі паставіў музыку на службу паэзіі, прымусіўшы яе падпарадкоўвацца законам жывой паэтычнай гутаркі.

У гісторыю рускай музыкі А. С Даргамыжскі ўвайшоў не толькі як аўтар «Русалкі» і «Каменнага госця». Ён з'яўляецца тварцом рускай жанравай музыкі для сімфанічнага аркестра. Вядома, яго аркестравыя творы не могуць раўняцца з сімфанічнымі творамі Глінкі, але тым не менш яны арыгінальныя і па замыслу і па выкананню, яны належаць да лепшых старонак рускай аркестравай літаратуры. «Казачок», «Баба-яга» і інш. поўны неперайманьнага юмару, бліскучай дасціпнасці.

Але ёсць галіна, у якой Даргамыжскі падымаецца часам да высокай тэхнікі. Гэта—раманс і песня. Звыш ста рамансаў, песень, камерна-вакальных ансамбляў складаюць спадчыну Даргамыжскага, не менш значную, чым яго оперная спадчына.

Рамансы і песні Даргамыжскага здзіўляюць сваёй тэматычнай рознастайнасцю, шырынёй мастацкага светапогляду.

У вядомым «Чарвяку» сама мелодыя, здаецца, малюе вобраз дробнага чынушы, шчаслівага тым, што за яго жонкай валочыцца сам начальнік — «яго яснавяльможнасць».

Даргамыжскі не заўсёды смяецца над сваімі персанажамі. Гогалеўскі «смех скрозь слёзы» здаецца нам у кароткай песні «Тытулярны саветнік».

Даргамыжскі нідзе не падымаецца да соцыяльнага працэсу, да вяршыны лірыкі Мусоргскага, але ў яго «Старым капралу» ўжо гучаць новыя ноты, якія можна было-б назваць матывамі грамадзянскай паэзіі ў музыцы.

У сваіх рамансах Даргамыжскі аддае даніну і рамантычнаму кірунку. Выдатнейшым вобразам гэтага роду з'яўляецца вядомае яго «Вяселле». «Вяселле» — сапраўдная песня ў гонар кахання і свабоды, кахання чыстага і магутнага.

Народнасць творчасці Даргамыжскага ярчэй за ўсё выявілася ў яго песнях. Недарма такія яго рэчы, як «Ванька-Танька», «Ліхарадушка», сталі народнымі песнямі і спяваюцца ў самых розных варыянтах.

Можна толькі пашкадаваць, што ў нас усё яшчэ параўнаўча мала спяваюць песні і рамансы Даргамыжскага, у прыватнасці ў самадзейных гуртках. У большасці сваёй песні Даргамыжскага простыя, незвычайна меладычныя і ясныя.

Рамансы Даргамыжскага, цэлая скарбніца яго песень, яго оперы і сімфанічныя творы назаўсёды ўвайшлі ў залаты фонд совецкай музыкальнай культуры.

У асобе А. С. Даргамыжскага мы ўшаноўваем памяць аснавальніка рускага музыкальнага рэалізма, выдатнага мастака, праніклівага музыкальнага мысліцеля. Даргамыжскі лепш чым хто-небудзь бачыў, куды вядуць шляхі развіцця рускай музыкі. Недарма ён зоркім поглядам геніяльнага майстра вымяраў глыбіню і багацце здатнасцяў Мусоргскага і на краю магілы благаславіў новага гіганта музыкі, сказаўшы, што Мусоргскі пойдзе далей за яго.

Руская музыка пайшла далей за Даргамыжскага, але вобраз вялікага мастака неўміручы, як неўміручыя яго творы.

В. ГАРАДЗІНСКІ.

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1938 г. НА ГАЗЕТУ „МЕДИЦИНСКИЙ РАБОТНИК"

Орган Народнага камісарыята аховы здароўя Саюза ССР. ПЕРЫЯДЫЧНАСЦЬ — ПЯЦЬ РАЗОЎ У МЕСЯЦ.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
З 1/III да канца года — 9 руб.
На 6 месяцаў — 5 р. 40 к.
На 3 месяцы — 2 р. 70 к.
На 1 месяц — 90 к.
Цана асобнага нумара — 15 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА Выдавецтвам «Биомедгиз» — Москва, Орликов пер. 3, а таксама ўсімі паштовымі аддзяленнямі, пісьманосцамі і ўсімі аддзяленнямі Саюздрука.

«БИОМЕДГИЗ».

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
14 лютага Абан. № 116
«БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ»

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ
Пачатак у 5, 7, 9 і 11 г. веч.

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ПА ТЫГРАВАЙ СЦЕЖЦЫ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
БЯЛЕЕ ПАРУС АДЗІНОКІ

Кінотэатр «Навіны дня» (памяшк. дзіцячага кінотэатра)
1) На совецкай радзіме
2) Сярэбраны дождж
3) Журнал Белдзяржкінохронікі № 1.

Гукавы кінотэатр «Спартак»
БЕСПАСАЖНІЦА

Гукавы кінотэатр „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Ад 14 лютага
на экране НОВЫ ГУКАВЫ МАСТ АЦКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫ ФІЛЬМ
ВЯЛІКАЕ СВЯТА
Звыш праграмы КІНОХРОН ІКА.
Штодзенна 5 сеансаў.
Пачатак сеансаў: 6.15, 7.30, 8.40, 9.45 і 11 гадзін веч.

ДЛЯ ПАСТАЯННАЙ РАБОТЫ Ў МЕНСКУ І НА ПЕРЫФЕРЫІ
ПАТРАБУЮЦЦА
з вытворчым стажам:
СТАРШЫЯ БУХГАЛТАРЫ,
БУХГАЛТАРЫ-РЭВІЗОРЫ,
БУХГАЛТАРЫ,
БУХГАЛТАР-ФІНАНСІСТ,
ЭКАНАМІСТ-ПЛАНАВІК,
КАРТАТЭТЧЫКІ.
Умовы па згодзе.
Звяртацца па адрасу: Совецкая, 55, тэл. 24-915.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а
ЛІТАРАТУРА
да XX гадавіны РСЧА і Ваенна-Марскога Флота
(на рускай мове)

СТАЛІН І. В. — АБ ТРОХ АСАБЛІВАСЦЯХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. Ваенгіз, 1938 г. Цана 10 кап.
ВАРАШЫЛАЎ К. Е. — СТАЛІН І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ. Ваенгіз, 1937 г. Цана 3 руб.
ГІСТОРЫЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ Ў СССР, том I. Ц. 20 р.
ГЕРАСІМАЎ І ЭРЛІХ—Н. ШЧОРС — баявы шлях, Ваенгіз, 1937 года. Цана 2 руб. 50 к.
НІКАЛАЙ ШЧОРС. Ваенгіз, 1937 года. Цана 30 кап.
БУДЗЁННЫ С. М.—БАЕЦ-ГРАМАДЗЯНІН, Партвыдат ЦК ВКП(б), 1937 г. Ц. 15 кап.
ЯК РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ЗАВАЯВАЛІ ЎЛАДУ І ПАБУДАВАЛІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА, Партвыдат ЦК ВКП(б), 1937 г. Цана 65 кап.
ТАЛСТОЙ А. — ХЛЕБ (АБАРОНА ЦАРЫЦЫНА). 1937. Цана 5 руб.
ФУРМАНАЎ. — ЧАПАЕЎ. Гослітвыдат, 1937 г. Цана 2 р.
СЕРАФІМОВІЧ А. — ЖАЛЕЗНЫ ПАТОК. Гослітвыдат, 1938 г. Цана 1 р. 75 к.

Указаную літаратуру патрабуйце ва ўсіх кніжных магазінах і кіёсках Беларддзялення КОГІЗ'а, а пры адсутнасці на мясцах заказы шліце: г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 50, БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а «КНІГА-ПОШТАЙ».
БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а.

Да XX гадавіны РСЧА і Ваенна-Марскога Флота
У МАГАЗІНЕ ІЗОПРАДУКЦЫІ Беларускага аддзялення КОГІЗ'а
(Менск, Совецкая 65, тэл. 23-712)
ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ Ў ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ
РОЗНАСТАЙНЫЯ ПАННО, ПАРТРЭТЫ КІРАЎНІКОЎ ПАРТЫІ І ЎРАДА, У РАМКАХ І БЕЗ РАМАК.
РАМЫ ДЛЯ ПАРТРЭТАЎ, ГЕРБЫ СССР — ІЛЮМІНАВАНЫЯ І ГІПСАВЫЯ. БЮСТЫ ПРАВАДЫРОЎ, СТАТУЭТКІ, БАРЭЛЬЕФЫ.
РЭПРАДУКЦЫІ З КАРЦІН АБ ЧЫРВОНАЙ ГВАРДЫІ, ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЕ.
ФОТААЛЬБОМЫ І ФОТАПАРТРЭТЫ ДЛЯ ВЫСТАВАК ДА XX ГАДАВІНЫ РСЧА І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА.
БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а.

ДЛЯ ВСЁ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ!
У ДЗІЦЯЧЫ УНІВЕРМАГ
Менскай канторы БЕЛПРАМГАНДЛЯ
(МЕНСК, ЛЕНІНСКАЯ 1/9, тэл. 25-747).
ПРЫБЫЎ І ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ
вялікі асартымент
ДЗІЦЯЧЫХ ЦАЦАК:
ВЯЛІКІ ВЫБАР ЛЯЛЕК РОЗНЫХ РАЗМЕРАЎ.
ТАНКІ, АЎТАМАБІЛІ (завадныя і незавадныя),
ГУМАВЫЯ І ЦЭЛУЛОЙДАВЫЯ ЦАЦКІ.
КАНСТРУКТАРЫ (металічныя і драўляныя),
РОЗНЫЯ НАСТОЛЬНЫЯ ІГРЫ (шахматы, шашкі, більярды і іншыя).
РОЗНЫЯ КОНІКІ, МЯДЗВЕДЗІ, ЗАЙЧЫКІ,
ДЗІЦЯЧЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ АПАРАТЫ, РУЖЖЫ, КАСКІ, ПІСТАЛЕТЫ, ПЛАНЕРЫ, ОАНКІ І МАСКІ.
Розныя асартымент дзіцячай мэблі: МАЛЬПОСТЫ, ЛОЖКІ, МАТРАЦЫ, СТОЛІКІ, КРЭСЛЫ і інш.
ТАКСАМА ЁСЦЬ ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ ШВЕЙНЫХ, ТРЫКАТАЖНЫХ, ГАЛАНТАРЭЙНЫХ І ПАРФУМЕРНЫХ ТАВАРАЎ.
ПА ЖАДАННЮ ПАКУПНІКОЎ КУПЛЕНЫ ТАВАР ДАСТАЎЛЯЕЦЦА НАДОМ БЯСПЛАТНА.
ДЫРЭКЦЫЯ.

У ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА
адкрыта ВЫСТАЎКА,
прысвечаная XX ГАДАВІНЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.
Выстаўка адкрыта з 11 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара — Чырвонаармейская, 9, 2-гі паверх, пакой № 16, тэл. 25-801 і 24-518.
ДЫРЭКЦЫЯ.

17-га лютага 1938 года ў г. Куйбышэве
Адбудзецца шосты тыраж
ВЫЙГРЫШАЎ ПА ПАЗЫЦЫЯ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ
(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)
Агульная колькасць выйгрышаў 1 мільён 60 тысяч выйгрышаў на суму 173 мілёны 920 тысяч рублёў.

Вучні 10 класа 5 сярэдняй школы выражаюць глыбокае спачуванне свайму таварышу Ю. БАРОНЕНКАВУ з прычыны пасцігнага яго гора—смерці БАЦЬКІ.

Калектыў супрацоўнікаў інстытута торфу АН БССР выказвае сваё спачуванне навуковаму работніку інстытута тав. САНЬКО П. М. з прычыны пасцігнага яго гора — смерці дачкі СТЭЛЫ.

Калектыў выкладчыкаў 5 сярэдняй школы гор. Менска з глыбокім жалем паведамляе аб смерці выкладчыка 3 класа БАРОНЕНКАВА Нікалая Гаўрылавіча, наследаваўшай 11 лютага, і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ 21-845

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. Тэлефоны рэдакцыі: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 20-830. АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21.353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21.846, літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-935, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25.189, адзела пісем — 20.844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21.556, аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № Г—5076 Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая 63.

Ю., М., Б.